Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЛІСТАПАДА 2016 г. АЎТОРАК № 230 (28340)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Пранікнёнае слова творцаў

Удзельнікам III з'езда грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі»

Паважаныя сябры!

Шчыра віншую вас з адкрыццём III з'езда грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі».

Лепшыя ўзоры літаратуры, праўдзівае, пранікнёнае слова творцаў заўсёды фарміравалі этычныя і эстэтычныя ідэалы, служылі станаўленню грамадства, умацаванню высокіх маральных прынцыпаў.

Важна, што нашы сучаснікі захоўваюць паважлівае стаўленне да кнігі, бачаць у ёй крыніцу мудрасці і ведаў.

Творчым дарам, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй літаратары здольныя зрабіць вялікі ўклад у справу асветы, патрыятычнае выхаванне моладзі, пашырэнне міжнародных культурных сувязей.

Жадаю ўдзельнікам з'езда натхнення, яркіх дасягненняў на карысць Беларусі, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Як паказвае сусветны вопыт, у машынабудаванні неабходна праводзіць комплексную мадэрнізацыю, будаваць новыя сучасныя заводы. Раней кіраўнікі нашых прадпрыемстваў не заўсёды актыўна працавалі на знешніх рынках. Крызіс у галіне прымусіў шукаць новыя рынкі збыту прадукцыі. І доля экспарту ў машынабудаванні беларускай прадукцыі ў Расію за апошнія гады знізілася, але вырасла ў краіны далёкага замежжа. Беларускае машынабудаванне сёння выйшла з рэцэсіі. У 2016 годзе тэмпы росту вытворчасці ў гэтай галіне ў параўнанні з 2015-м склалі 103%».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.11.2016 г.

Долар ЗША	1,9665	▲
Еўра	2,0942	▲
Рас. руб.	0,0302	▼
Укр. грыўня	0,0766	▲

ISSN 1990 - 763X



Фота БЕЛТА.

НА ДОЎГУЮ ПЕРСПЕКТЫВУ

Беларусь і Азербайджан будуць супрацоўнічаць па ўсіх напрамках

Азербайджан можа разлічваць на Беларусь як на самага блізкага сябра. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на перамовах з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым у фармаце «сам-насам».

Перамовам папярэднічала цырымонія афіцыйнай сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з Ільхамам Аліевым у рэзідэнцыі Прэзідэнта Азербайджана «Загульба». Пасля выканання гімнаў дзвюх краін і цырыманіялу з удзелам роты ганаровай варты прэзідэнты пачалі перамовы спачатку ў фармаце «сам-насам», а затым у пашыраным складзе.

«Вы можаце на нас разлічваць як на самых блізкіх сяброў. Калі мы чымсьці можам быць карысныя вам у Азербайджане, мы заўсёды гэта зробім. Нашы магчымасці вы добра ведаеце, вы вялікі сябар Беларусі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — У нас няма закрытых тэм, мы супрацоўнічаем па ўсіх напрамках і будзем супрацоўнічаць па ўсіх напрамках. Мы нікому не нашкодзім нашым супрацоўніцтвам, мы адкрытыя і далей будзем адкрытыя, публічныя пры абмеркаванні самых надзённых пытанняў нашай рэчаіснасці».

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СМАК КЛОПАТУ

Ілона ФУРМАНЁНАК — самы малады супрацоўнік тэрытарыяльнага Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ушацкага раёна. Яна ўжо другі год дапамагае пажылым і адзінокім жыхарам вёскі Старое Сяло і саміх Ушачаў. Пенсіянерцы Валянціне ЛАБЕЦКАЙ і яе 92-гадовай матулі Ганне ШЧЭРБІК у дзень, калі рабілася фота, дапамагала шаткаваць капусту. Але і для шчырай размовы час знайшоўся, бо нярэдка старым людзям добрае слова патрэбна не менш, чым фізічная дапамога.

■ Блізкая ўлада

КАЛІ Ў КВАТЭРАХ ХОЛАДНА, НА ПРАМОЙ ЛІНІІ «ГОРАЧА»

У гэтую суботу традыцыйна прайшлі прамыя тэлефонныя лініі з прадстаўнікамі выканаўчай улады па ўсёй краіне. Карэспандэнты «Звязды» працягваюць браць удзел у «галасавых сустрэчах» жыхароў розных рэгіёнаў Беларусі з адказнымі за пэўныя тэрыторыі асобамі. Гэтым разам у цэнтры ўвагі Фрунзенскі раён горада Мінска і Гарадоцкі раён Віцебскай вобласці.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

НА ДОЎГУЮ ПЕРСПЕКТЫВУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларусь гатовая супрацоўнічаць з Азербайджанам у нафтавай сферы на доўгую перспектыву, заявіў Прэзідэнт Беларусі на перамовах са сваім азербайджанскім калегам ужо ў пашыраным фармаце.

«Калі ў вас ёсць цікавасць на рынку ў Еўропе, ды і не толькі ў Еўропе, давайце сядзем і дамовімся. Мы гатовыя на доўгую перспектыву працаваць з Азербайджанам у выпадку дамоўленасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў лідару Азербайджана за нядаўнюю пастаўку нафты ў Беларусь: у кастрычніку на Мазырскі НПЗ паступіла каля 85 тысяч тон нафты. «Вы не першы раз нас падтрымліваеце, але гэта была разавая падтрымка. Я разумею, што любы вытворца нафты павінен мець стратэгію. Мы гатовы ў гэтым плане рухацца настолькі далёка, наколькі гэта ў інтарэсах Азербайджана», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што партнёрства ў нафтавай сферы — гэта не галоўнае ў адносінах і перамовах паміж Беларуссю і Азербайджанам. «Але гэта важны напрамак нашага супрацоўніцтва. Ёсць жаданне і зацікаўленасць — калі ласка. У нас два наймагутныя, самыя сучасныя нафтаперапрацоўчыя заводы. Мы заканчваем іх мадэрнізацыю, выходзім на больш чым 90% глыбіні перапрацоўкі нафты. Мы гатовыя разгледзець у гэты момант і давальніцкія пастаўкі вашай нафты», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Азербайджан настроены на актыўны працяг супрацоўніцтва з Беларуссю ва ўсіх сферах, заявіў у сваю чаргу Ільхам Аліеў. Нашы краіны могуць за кароткі час павялічыць аб'ём тавараабароту пры правільнай арганізацыі работы. «Мы рады таму, як складваюцца адносіны. Але ўзровень ўзаемнага гандлю нас радаваць не можа. Мы сёння ўжо абмяняліся думкамі, як пашырыць дыяпазон супрацоўніцтва, наменклатуру і павялічыць тавараабарот. Для гэтага ёсць вельмі добры патэнцыял. Мы можам павялічыць узаемны экспарт за вельмі кароткі час, правільна арганізаваўшы работу», — упэўнены Ільхам Аліеў. Ён таксама адзначыў, што Беларусь і Азербайджан з'яўляюцца надзейнымі партнёрамі не толькі адзін для аднаго, але для трэціх краін, падкрэсліўшы: «На міжнароднай арэне нашы краіны карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам з-за прынцыповай палітыкі і сумленнасці ў адносінах».

Па выніках перамоў бакі падпісалі пакет дакументаў аб развіцці супрацоўніцтва ў розных сферах. У прыватнасці, падпісаны план мерапрыемстваў па выкананні Праграмы сацыяльна-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Азербайджанам да 2025 года. Для развіцця ўзаемадзеяння ў сферы аграпрамысловага комплексу падпісана комплексная праграма супрацоўніцтва паміж краінамі да 2025 года.

У сферы фізічнай культуры зацверджана праграма супрацоўніцтва паміж Міністэрствам спорту і турызму Беларусі і Міністэрствам моладзі і спорту Азербайджана на 2017—2018 гады. Паміж дзяржавамі таксама падпісана праграма супрацоўніцтва ў сферы адукацыі на 2016—2020 гады. Для барацьбы з мытнымі парушэннямі, звязанымі з перамяшчэннем тавараў паветраным транспартам, падпісаны пратакол аб узаемадзеянні паміж дзяржаўнымі мытнымі камітэтамі.

Падпісаны таксама пагадненні аб усталяванні міжрэгіянальных сувязяў паміж Гродна і выканаўчай уладай Габалінскага раёна, аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Беларусі і ЗАТ «Азербайджанскае тэлебачанне і радыёвяшчанне», а таксама шэраг іншых дакументаў.

Сёння афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Азербайджан працягнецца. Праграмай запланавана таксама сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Азербайджана Артурам Расі-задэ.

Паводле БЕЛТА.

■ Парламенцкі дзённік

Стратэгія: ад Еўропы да Кітая

У выхадныя старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ прыняў удзел у Глабальнай канферэнцыі ААН па ўстойлівым транспарце, якая адбылася ў Ашхабадзе.

На ёй спікер верхняй палаты беларускага парламента прапанаваў стратэгію комплекснага развіцця ўстойлівага шматмадальнага транспартнага калідора з Еўропы ў Кітай. Яго галоўны прынцып — ва ўзаемным дапаўненні праектаў Вялікага шаўковага шляху і Еўразійскага эканамічнага саюза.

Акрамя таго, старшыню Савета Рэспублікі і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Туркменістане Алега Табанюхава прыняў Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў. Адбыўся дыялог, падчас якога бакі абмеркавалі ў тым ліку пытанні будаўніцтва Гарлыкскага горна-ўзбагачальнага камбіната, якое знаходзіцца на завяршальнай стадыі.

Вікторыя АСТРОЖСКАЯ.

Нагоды для супрацоўніцтва

Наша краіна налета будзе старшынстваваць у Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве

З гэтай нагоды член парламента Італіі, старшыня парламенцкай дэлегацыі Італіі пры Парламенцкай Асамблеі ЦЕІ Ладавіка САНЕГА наведаў Мінск і сустрэўся са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэем РЫБАКОМ.

Былі абмеркаваны двухбаковыя адносіны паміж краінамі і перспектывы наступнага года. У сустрэчы ўдзельнічаў і пасол Італіі ў Мінску Стэфана Б'ЯНКІ.

Андрэй Рыбак у сваю чаргу падкрэсліў, што беларуска-італьянскае супрацоўніцтва з'яўляецца важным для нашай краіны. «Прычын для гэтага многа. Італьянская эканоміка — трэцяя на еўрапейскім кантыненце. Акрамя таго, Італія з'яўляецца важным палітычным гульцом у Еўропе, таму мы не можам сабе дазволіць не пашыраць кантакты з гэтай дзяржавай. Вельмі важна, што італьянскі сенатар выказаў цікавасць менавіта да пытанняў узаемадзеяння ў рэальным сектары эканомікі, якімі займаецца наша камісія. Сёння мы кажам у тым ліку пра аднаўляльныя крыніцы энергіі, таму што ні ў Беларусі, ні ў Італіі няма багатых энергетычных рэсурсаў і праблема дыверсіфікацыі энергакрыніц важная для абедзвюх краін. Італьянскія кампаніі вельмі зацікаўлены ў прысутнасці на рынках краін ЕАЭС, таму нашы транспартныя магчымасці — гэта таксама нагода для супрацоўніцтва».

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

МІСІЯ — ДАПАМАГАЦЬ

Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа адзначае 95-годдзе

На працягу ўсяго свайго існавання гэта арганізацыя асацыюецца ў людской свядомасці з дапамогай, якая будзе аказана кожнаму, хто ў ёй мае патрэбу. «Наш асноўны прынцып — гуманнасці — мае на ўвазе садзейнічанне дзяржаве ў тым, каб чалавек, які трапіў у бяду, а гэта можа быць ваенны канфлікт ці нейкая прыродная катастрофа, не застаўся з ёю сам-насам, — адзначае **генеральны сакратар БТЧК, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вольга МЫЧКО.** — Большая частка нашай работы адбываецца ў мірны час, калі чалавек, які трапіў у сур'ёзную крызісную сітуацыю, таксама можа разлічваць на падтрымку».

Найбольш актуальна ў апошнія гады аказанне дапамогі грамадзянам Украіны. Дапамогу атрымліваюць бежанцы, якія атрымалі такі статус на тэрыторыі нашай краіны, а таксама людзі, якія маюць дадатковую абарону. Акрамя таго, за 8 гадоў 64 800 чалавек атрымалі дапамогу па накіраванні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Беларускі Чырвоны Крыж рэалізуе зараз 26 праектаў, якія прыцягваюць інвестыцыі ў краіну. Летась гэта было каля 3 млн долараў. Значная частка праектаў скіравана на аказанне сацыяльнай і медыцынскай дапамогі, у тым ліку замежнікам, якія пражываюць на тэрыторыі краіны.

Аб тым, што справа міласэрнасці знаходзіць водгук у беларусаў, сведчыць наступная лічба: сёння ў Беларускага Чырвонага Крыжа — каля 22 тысяч валанцёраў, галоўным чынам, з ліку моладзі.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

З юбілеем супрацоўнікаў і валанцёраў Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «За гэтыя гады ваша арганізацыя стала надзейным памочнікам дзяржавы ў вырашэнні медыка-сацыяльных і гуманітарных праблем», — гаворыцца ў віншаванні.

...НА ПРАМОЙ ЛІНІІ «ГОРАЧА»

Сталіца на сувязі

Кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна адказаў на пытанні яго жыхароў. Пасаду кіраўніка самага буйнога, а такім чынам, і самага праблемнага раёна Мінска **Арцём ЦУРАН** займае ўсяго месяц, так што прамая тэлефонная лінія, якая прайшла ў гэтую суботу, стала для яго своеасаблівым «дэбютам». Карэспандэнт газеты «Звязда» наведаўся ў адміністрацыю падчас яе правядзення, каб з першых вуснаў даведацца, якія пытанні для жыхароў раёна зараз стаяць асабліва востра і як іх можна вырашыць.

Як толькі стрэлка гадзінніка паказвае роўна дзевяць, раздаецца першы званок. Заяўнік звяртаецца з праблемай, пра якую ў гэты дзень мы яшчэ не раз пачуем, — у кватэры няма ацяплення і гарачай вады. Пытанні такога тыпу падлягаюць неадкладнаму разгляду, таму на «прамой лініі» прысутнічае **начальнік аддзела гарадской гаспадаркі Фрунзенскага раёна Арцём ЛАБКО.** Пакуль запісваюць даныя — прозвішча, імя, імя па бацьку, хатні адрас і тэлефон для сувязі — таго, хто звярнуўся, адказны за гэтую сферу Арцём Лабко пачынае высвятляць, чым выкліканая сітуацыя, якая склалася. Часцей за ўсё прычына ў аварыях рознай ступені складанасці, ліквідацыя якіх патрабуе часу. У гэтым выпадку адзінае, што можна зрабіць, — прыспешыць рамонтнікаў. Так у адным з дамоў забеспячэнне кватэр гарачай вадой наладзілі, аднак не давялі да канца, з-за чаго яна награвалася недастаткова. Гэтую праблему ўдалося вырашыць па ходу правядзення прамой лініі.

Хвалюе многіх жыхароў, асабліва сталага ўзросту, і тэмпература ў кватэрах пры ўключаным ацяпленні. Па санітарных нормах яна павінна быць у межах +18 — +24 градусы па Цэльсію, аднак некаторым здаецца, што +18—20 градусаў — гэта недастаткова цёпла. Тым не менш, калі нельга асобна адрэгуляваць узровень цяпла ў канкрэтнай кватэры, вырашыць гэтае пытанне амаль немагчыма. Як толькі павялічваецца тэмпература, расце і аплата, а з гэтым могуць быць не згодныя іншыя жыхары дома.

Яшчэ адзін блок пытанняў быў звязаны з правядзеннем капітальнага рамонту. З кім і як павінны ўзгадняць пералік работ і каштарыс, якія механізмы кантролю падрадчыкаў, хто і за чый кошт павінен праводзіць падрыхтоўчы этап у кватэрах, якія істотна закранае «мадэрнізацыя» дома. Адзін з заяўнікаў да размовы з кіраўніком адміністрацыі падрыхтаваўся грунтоўна: ён зачытваў вытрымкі з дагавораў, называў тэхнічныя параметры, якія не выконваюцца. Вядома, з ходу адказаць на такія пытанні складана. Таму законнасць умоў правядзення работ будзе падвергнута маштабнай праверцы. У цэлым, капітальныя рамонты — адна з найбольш балючых тэм для раёна ў галіне гарадской гаспадаркі.

Сустракаюцца і пытанні, якія на гэтай прамой лініі не паўтараюцца, аднак добра знаёмыя прадстаўнікам адміністрацыі. Напрыклад, кватаранты, якія прыносяць шмат нязручнасцяў суседзям, або вытворчасці, арганізаваныя на кватэры. На парадку дня і тэма добраўпарадкавання: ці пракладуць пешаходную дарожку па пустцы і калі ліквідуюць вялізную яму на выхадзе з пад'езда. Ужо не першы раз дзве пажылыя жанчыны-суседкі просяць перанесці далей ад іх вокнаў арэлі, бо дзеці з суседняга двара, у якіх няма сваёй пляцоўкі, прыходзяць да іх і ствараюць шмат шуму. Аднак паколькі ўсе нормы размяшчэння аб'ектаў выкананыя, зрабіць гэта немэтазгодна.

Нягледзячы на тое, што на «прамой лініі» прысутнічаў спецыяліст у галіне будаўніцтва жылля, з пытаннем па гэтай тэме звярнуўся ўсяго адзін чалавек. Сям'я з трыма дзецьмі, адно з якіх інвалід, а другое ўжо паўналетняе, цікавілася магчымасцю атрымання кватэры з ільготамі. **Начальнік аддзела жыллёвай палітыкі Сяргей ШАКЕЛЬ** запрасіў заяўніка на асабістую гутарку, каб больш падрабязна разабраць гэта пытанне.

Маштабныя тэмы, такія як, напрыклад, выкананне правілаў, устаноўленых у зоне свабоднай ад курэння, у лесапарку Мядзведжына, а таксама агульнае паляпшэнне ўмоў для падтрымання здаровага ладу жыцця, Арцём Цуран прапаноўваў суразмоўцу абмеркаваць асабіста ў гадзіны прыёму грамадзян. Падчас прамой лініі на прыём было запісана тры чалавекі.

Вялікі працэнт тых, хто звярнуўся, складаюць людзі з інваліднасцю. Пажылая жанчына, у кватэры якой зарэгістраваны сын, але разам яны не пражываюць, не можа атрымаць ільготы на аплату камунальных паслуг. На такое пытанне адказаць можна і адразу: усё законна, тым не менш ёй будзе высланы падрабязны адказ з дакладным тлумачэннем яе правоў са спасылкай на канкрэтныя заканадаўчыя акты. Яшчэ ў адной пажылой жанчыны, якая перасоўваецца на інваліднай калясцы, у пад'ездзе не абсталяваны пандусы. А падчас рамонтных работ на ганку прыбралі нават поручань, трымаючыся за які можна было неяк спусціцца хоць бы на мыліцах. Старшыня адміністрацыі паабяцаў узяць гэтае пытанне на асабісты кантроль.

Усяго за тры гадзіны, пакуль доўжылася прамая лінія, паступіў 31 званок. Гэтую лічбу можна лічыць рэкордная, у мінулы «пікавы» раз іх было 26. На зімовы перыяд заўсёды прыходзіцца большая колькасць зваротаў, паколькі наступствы аварый, звязаныя з пастуленнем гарачай вады, адчуваюцца больш востра. Кожнаму заяўніку на працягу 15 дзён будзе накіраваны адказ з тлумачэннем, калі тэма звароту патрабуе дадатковага вывучэння і праверкі — не пазней чым праз месяц.

Бывае і без званкоў

У мінулую суботу ў Гарадоцкі райвыканкам на «прамую лінію» не тэлефанавалі. Тры гадзіны званкоў чакала **Ірына ДЗЯМ'ЯНЕНКА, кіраўнік спраў.** Яна расказала карэспандэнту «Звязды», што колькасць зваротаў змяншаецца.

— Сёлета іх было 95. У тым ліку 42 — пра дзейнасць ЖКГ, 15 — пра стан дарог, столькі ж — па пытаннях аграпрамысловага комплексу. Некаторыя праблемы вырашаюцца ў той жа дзень. У прыватнасці, ачысцілі ад снегу дарогу паміж дзвюма вёскамі. Іншыя — на працягу некалькіх дзён, — расказвае Ірына Дзям'яненка.

Сёлета жыхары гарадскога пасёлка Езярышча прасілі прачысціць трубы сістэмы пячнога ацяплення дома. А заяўнікі, якія пражываюць у райцэнтры па вуліцы Баграмяна, прасілі аднавіць водазабеспячэнне гарачай вадой. На вуліцы Гагарына на фасадах двух дамоў пасля рамонту не замацавалі нумары. Усе гэтыя просьбы былі задаволены.

Неяк з Езярышча пазванілі наконт адсутнасці цэменту ў прамтаварнай краме спажывецкай кааперацыі. Праз дзень даставілі больш за 1,3 тоны. Людзі нярэдка тэлефануюць, калі ў крамах чагосьці сярод тавараў няма, а таксама, каб праверыць чуткі, ці будзе зачынена крама ў вёсцы.

Бываюць і вельмі нечаканыя просьбы. Напрыклад, каб з вёскі Халамер'е аўтобус прыбываў у Гарадок менавіта да 19 гадзін 15 хвілін! Улада і транспартнікі пайшлі насустрач. І цяпер на вакзале аўтобус спыняецца ў 19.10.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*
Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Надзеі БУЖАН.

АД ВІНТА!

Шэсць новых верталётаў Мі-8 папоўнілі авіяпарк Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны

На ўрачыстай перадачы вінтакрылых машын асабоваму складу 50-й змешанай авіяцыйнай базы пабывалі карэспандэнты «Звязды». І аднымі з першых даведаліся пра магчымасці баявой тэхнікі.

І гэта толькі першая партыя верталётаў, пастаўленых у межах кантракта, падпісанага падчас Міжнароднага ваенна-тэхнічнага форуму «Армія-2015» з прадстаўнікамі холдынгу «Верталёты Расіі». Яшчэ шэсць баявых машын паступяць на ўзбраенне беларускага войска ў наступным годзе.

Першым асабовы склад 50-й змешанай авіябазы павіншаваў **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ,** пажадаўшы авіятарам поспехаў у асваенні новай тэхнікі і яе безаварыйнай эксплуатацыі.

Генеральны дырэктар акцыянернага таварыства «Верталёты Расіі» Аляксандр МІХЕЕЎ назваў прыняцце на ўзбраенне беларускай арміі новых Мі-8 вельмі важнай падзеяй для верталётабудаўнікоў Расіі. «Гэтыя верталёты — адны з самых лепшых у свеце, — падкрэсліў кіраўнік холдынгу. — Яны зарэкамендавалі сябе ва ўсіх гарачых кропках і спецаперацыях. Прынятыя на ўзбраенне ў тым ліку Міністэрствам абароны Расійскай Федэрацыі, яны з'яўляюцца ўзорамі верталётнай тэхнікі вытворчасці Казанскага верталётнага завода».

Нягледзячы на нялётнае надвор'е (а ўчора, калі адбывалася ўрачыстасць, на аэрадроме авіябазы без перабольшання бушавала завіруха), новыя верталёты паднялі ся ў неба. І не толькі, каб прадэманстраваць, што ў любое надвор'е лётчыкі могуць выканаць задачу па прызначэнні. Лётныя экіпажы ва ўзаемадзеянні з сіламі спецыяльных аперацый на практыцы паказалі некаторыя магчымасці баявых машын.

Верталёт Мі-8 МТВ-5 здольны выконваць задачу як днём, так і ноччу, у самых розных метэаўмовах, можа ўзлятаць і прызямляцца з непрадугледжаных для гэтага пляцовак. Баявая машына адрозніваецца сучасным комплексам пілатажна-навігацыйнага абсталявання і радыёсувязі, сістэмай беспарашутнага дэсантавання, якая адначасова дазваляе праводзіць спуск чатырох чалавек. Колькасць пасадачных месцаў павялічана тройчы, што дае магчымасць адначасова дэсантаваць да 35 чалавек, ажыццявіць транспарціроўку да 12 параненых разам з суправаджальным медыцынскім персаналам.

— Для нашай тэрыторыі гэта не толькі эфектыўны сродак агнявой падтрымкі, а і транспартны сродак для забеспячэння баявых дзеянняў войск, — адзначыў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.** — Верталёт Мі-8 МТВ-5 дастаткова мадэрнізаваны, ён змяшчае вельмі эфектыўную сістэму выяўлення снарадаў або ракет, што поўнасцю засцерагае экіпаж ад небяспекі.

Як расказаў **камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны генерал-маёр Алег ДВІГАЛЕЎ,** верталёт можа выкарыстоўвацца не толькі ў баявых і транспартных, а і ў выратавальных і разведвальных мэтах. «Усе верталёты прыляцелі сваім ходам з Казані, — удакладніў камандуючы ВПС і войскамі СПА. — Верталётчыкі, якія пілатавалі іх у Беларусь, вельмі задаволены. Нават параўноўвалі тэхніку з самымі сучаснымі аўтамабілямі».

Авіяцыйны парк Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Беларусі пачаў абнаўляцца яшчэ летась. Праводзіцца мадэрнізацыя тых узораў лятальных апаратаў, якія ўжо стаяць на ўзбраенні беларускай арміі. У красавіку мінулага года навукова-вытворчая карпарацыя «Іркут» паставіла ў нашу краіну чатыры вучэбна-баявыя самалёты Як-130, якія ўжо актыўна асвойваюць лётчыкі 116-й гвардзейскай штурмавой авіяцыйнай базы. На мінулым тыдні славутае воінскае злучэнне прыняло на ўзбраенне яшчэ чатыры вучэбна-баявыя самалёты Як-130. Застаецца толькі спадзявацца, што і тыя, і іншыя будуць прыменены толькі ў мірных мэтах.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

Ажыццявіць дэсант адначасова могуць да 35 вайскоўцаў.

Штурман авіяцыйнага атрада капітан Дзяніс МАЦУЛЕВІЧ.

■ Ну і ну!

«ЭСКУДА, РУПІІ, ПЕСА, ДЫРХЕМЫ...»

Хлопцы ў сталіцы абменьвалі экзатычную валюту

Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі крымінальнай міліцыі Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі чацвярых мінчан, якія ажыццяўлялі незаконны абмен валюты.

— Хлопцаў затрымалі падчас рэйдаў. Паміж сабой яны не былі знаёмыя, але спосаб заробку «вынайшлі» аднолькавы: абмен замежнай валюты незаконным шляхам, — расказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля Ганусевіч. — Кліентаў шукалі каля абменных пунктаў. Двое затрыманых з'яўляюцца калекцыянерамі грашовых купюр, яшчэ двое прывезлі іх з месцаў адпачынку. Ва ўсіх выпадках прадметам прапановы выступала экзатычная валюта: баты з Княства Тайланд, дырхемы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, флорыны Арубы, кубінскія песа, індыйскія рупіі, эскуда Каба-Вердэ, фунты стэрлінгаў Каралеўскага банка Шатландыі. У адносінах да затрыманых складзены адміністрацыйныя пратаколы. Хлопцам пагражае штраф у памеры да ста базавых велічынь з канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Пасля падзеі

ТЭАТР ПА СКЛАДАХ

Найлепшае паводле журы Нацыянальнай тэатральнай прэміі

Галоўная інтрыга прэміі, што ўручаецца раз на два гады, разгарнулася вакол драматычнага тэатра: на ўзнагароду прэтэндавалі ажно восем тэатраў з усёй краіны. Птушка шчасця (ці беларускі бусел, увасоблены ў статуэтцы) прыляцела да рэжысёра Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Мікалая Пінігіна — узнагароду за «найлепшы спектакль драматычнага тэатра» атрымала яго пастаноўка «Чайкі» Антона Чэхава. За «Найлепшую жаночую ролю» журы адзначыла актрысу Марыну Дзянісаву ў спектаклі-размове Таццяны Траяновіч «Ілюзіі» (Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь і Цэнтр эксперыментальнай рэжысуры БДАМ). Спектакль Саўлюса Варнаса па матывах аповесці Льва Талстога «Крэйцарава саната» Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра таксама не застаўся без увагі: акцёр Іван Трус узяў прыз за «найлепшую мужчынскую ролю».

Найлепшай пастаноўкай па творы беларускага аўтара прызналі прысвечаны Уладзіміру Мулявіну спектакль «Пясняр» Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага (рэжысёр Валянціна Еранькова). Спектакль, створаны паводле п'есы маладога драматурга Васіля Дранько-Майсюка, пачаў збіраць высокія ацэнкі яшчэ летась.

У катэгорыі прафесійнага тэатра лялек абышлося без павышанай канкурэнцыі: абодва дайшоўшыя да гледача спектаклі атрымалі дыпломы. Узнагарода за найлепшы спектакль і найлепшую жаночую ролю перайшла да Брэсцкага тэатра лялек за пастаноўку Руслана Кудашова «ФРО». Найлепшай работай акцёраў-мужчын палічылі выкананне ролі Лукі Мікалаем Сцешыцам у спектаклі «На дне» Магілёўскага абласнога тэатра лялек. А рэжысёр гэтага спектакля Ігар Казакоў атрымаў сваю ўзнагароду за «найлепшы спектакль для дзяцей і юнацтва» — ім прызналі пастаноўку «Самы маленькі самалёт на свеце». Найлепшая мужчынская роля ў дзіцячым тэатры адышла да Беларускага тэатра «Лялька» за выкананне ролі клоўна Піка Сяргеем Талкачом у спектаклі «Горад клоўна Піка».

Прадказальнымі можна назваць вынікі і ў секцыі музычнага тэатра. Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр (які толькі і быў прадстаўлены ў гэтай катэгорыі) атрымаў статуэтку за спектакль «Мая цудоўная лэдзі» рэжысёра-пастаноўшчыка Ганны Маторнай, дзе быў задзейнічаны выканаўца найлепшай мужчынскай ролі Віктар Цыркуновіч. «Вяселле ў Малінаўцы» Міхаіла Кавальчыка адзначылі прызам за найлепшую жаночую ролю (Лідзія Кузьміцкая).

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета ўзяў узнагароды за найлепшыя спектаклі оперы і балета («Царская нявеста» і «Маленькі прынц» адпаведна). Нацыянальную прэмію атрымала і наша славутае мецца-сапрана Аксана Волкава — «самая Кармэн» у беларускай оперы (і «Найлепшая жаночая роля» паводле журы). Сярод артыстак балета такая ўзнагарода дасталася Людміле Хітровай (за партыю ў спектаклі «Лаўрэнсія»). Станіслаў Трыфанаў (опера «Царская нявеста») і Канстанцін Геронік (балет «Маленькі прынц») атрымалі прызы за найлепшыя мужчынскія ролі.

У межах «Нацыянальнай тэатральнай прэміі» размяркоўваліся і дадатковыя ўзнагароды. Міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў уручыў прэмію «Мецэнат тэатра» старшыні праўлення Беларусбанка Сяргею Пісарыку. Прыз «Натхненне» з рук знакамітага беларускага драматурга Аляксея Дударава за таленавітую арганізацыйную дзейнасць атрымаў першы намеснік генеральнага дырэктара Вялікага тэатра Уладзімір Рылатка. Сам драматург Аляксей Дудараў з рук вялікай прыхільніцы беларускага тэатра Лідзіі Ярмошынай атрымаў узнагароду «За ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва».

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.

Падчас пастаноўкі «Чайка» Купалаўскага тэатра — найлепшага спектакля драматычнага тэатра.

■ Надвор'е

Холад прыціснe

УЖО Ў СЕРАДУ НОЧЧУ СІНОПТЫКІ ПРАГНАЗУЮЦЬ МЕСЦАМІ ДА МІНУС 15 ГРАДУСАЎ

Ужо на гэтым тыдні на тэрыторыю Беларусі прыйдзе сапраўдная зіма, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

Паводле слоў спецыяліста, на гэты раз нас чакае генеральнае наступленне халадоў, бо сярэдняя тэмпература паветра будзе на 2—4 градусы ніжэйшая за норму. Праўда, у апошнія дні восені на тэрыторыі краіны працягне яшчэ гаспадарыць халодная, але няўстойлівая паветраная маса і атмасферныя франты. Так, сёння на большай частцы краіны пройдзе кароткачасовы мокры снег. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да мінус 5 градусаў. У сераду амаль паўсюдна пройдзе мокры снег, па захадзе — з дажджом. У асобных раёнах краіны магчымы слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе 4—11 марозу, пры праясненнях чакаецца да мінус 15 градусаў, удзень — ад мінус 5 градусаў на ўсходзе да 2 цяпла на захадзе краіны.

У першыя дні снежня нас чакае зімовае надвор'е, якое будзе вызначацца атмасфернымі франтамі і халоднымі паветранымі масамі арктычнага паходжання. Таму да канца тыдня на большай частцы нашай тэрыторыі прагназуецца снег, мокры снег, а ў чацвер на паўднёвым захадзе — мокры снег з дажджом. У асобных раёнах магчымы слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ў чацвер ноччу складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень — ад мінус 3 да 2 цяпла. У пятніцу ўначы чакаецца 1—7 марозу, удзень — ад нуля да мінус 5 градусаў.

Начальнік службы айчынных сіноптыкаў адзначыў, што ў выхадныя стане яшчэ халадней. Тэмпература паветра ўначы будзе складаць 3—9 марозу, пры праясненнях — да мінус 10—13 градусаў. Удзень прагназуецца ад нуля да мінус 7 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ПАСЛЯ ФІДЭЛЯ

Які «расклад» для Вострава Свабоды?

На выхадныя галоўная сусветная навіна аказалася з разраду сумных. У ноч на суботу пайшоў з жыцця чалавек планетарнага маштабу, да меркавання якога чуйна прыслухоўваліся не толькі на яго роднай Кубе і ў Лацінскай Амерыцы, а і без перабольшання ва ўсіх кутках планеты. На 91 годзе жыцця нас пакінуў Фідэль Аляхандра Кастра Рус, проста Фідэль, ці Камандантэ, як яго называлі сотні мільёнаў людзей. Ці не апошні з той кагорты, пра якіх перш за ўсё згадваюць, кажучы пра ролю асобы ў гісторыі. З адыходам Фідэля незваротна змянілася эпоха. А што чакае Кубу?

ГІСТОРЫЯ АПРАЎДАЛА

Адметная дэталь: Фідэль Кастра пайшоў з жыцця роўна праз 60 гадоў пасля таго, як пачаўся адлік гісторыі кубінскай рэвалюцыі, што стварыла Востраў Свабоды. Менавіта 25 лістапада 1956-га яхта «Гранма», на якой знаходзіўся атрад з 82 чалавек, сярод іх — Фідэль, яго брат Рауль, Чэ Гевара (судна падцякала і было разлічана на значна меншую колькасць пасажыраў), падняла якар і накіравалася да Кубы. А ў пачатку 1959-га шматтысячная Паўстанцкая армія пад кіраўніцтвам Камандантэ ўвайшла ў Гавану. «Я пачынаў рэвалюцыю, маючы за сабой 82 чалавекі, — сказаў пасля Фідэль Кастра. — Калі б мне прыйшлося паўтарыць гэта, мне хапіла б пятнаццаці ці нават дзесяці. Дзесяць чалавек і абсалютная вера. Усё роўна колькі вас. Важна верыць і важна мець дакладны план. Тое, што мы зрабілі, павінна было навучыць нас, што немагчымага няма. Бо тое, што здавалася немагчымым учора, стала магчымым сёння. І таму нішто не падасца нам немагчымым заўтра».

Часцей здараецца, што рэвалюцыянераў фарміруе сацыяльнае становішча ледзь не з калыскі: калі цябе з нараджэння акружае галеча, хочаш не хочаш ты зробішся бунтаром. Фідэль быў не з такіх — сын плантатара захапіўся левымі ідэямі толькі на юрфаку Гаванскага ўніверсітэта, дзе прачытаў Леніна, Сталіна і Троцкага. Удзельнічаў у прафсаюзным руху, абараняў у судах бедных сялян, разам з іншымі студэнтамі ладзіў дэманстрацыі перад амерыканскім пасольствам. Першы вопыт рэвалюцыйнай барацьбы атрымаўся няўдалым: Кастра прыняў удзел у спробе зрынуць дамініканскага дыктатара Трухільё, але аперацыя правалілася. Затое паўстанне ў Калумбіі, пачатак якога супаў з тым момантам, калі Фідэль знаходзіўся ў Багаце, паказала яму, якой страшнай сілай з'яўляецца народны гнеў і як бяссільна ён згасае, калі няма каму ўзначаліць пратэст.

У 1952 годзе на Кубе адбыўся пераварот, да ўлады прыйшоў дыктатар Фульхенсіа Батыста. Налета Фідэль і яго аднадумцы паспрабавалі ўзяць штурмам казармы Манкада, спадзеючыся справакаваць тым самым паўстанне ў правінцыі Ар'ентэ. Аперацыя правалілася, Кастра з яго таварышамі судзілі. На працэсе Фідэль выступіў са сваёй знакамітай прамовай, скончыўшы яе фразай «Гісторыя мяне апраўдае». У выніку ён атрымаў 15 гадоў турмы, але праз два гады выйшаў па амністыі. Асцерагаючыся, што рэжым Батысты не пакіне яго ў спакоі, Кастра з'ехаў у Мексіку, дзе адразу ж стаў рыхтавацца да вяртання на радзіму — гэтым разам са зброяй і на чале атрада верных прыхільнікаў.

Палітычнай праграмай Фідэля стаў яго «Маніфест нумар адзін» — з забаронай латыфундый, перадачай зямель сялянам, індустрыялізацыяй, нацыяналізацыяй і бясплатнай адукацыяй. Што і пачало ўвасабляцца ўжо ў 1959-м, пасля перамогі рэвалюцыі. Яе, дарэчы, падтрымалі многія заходнія інтэлектуалы, у тым ліку амерыканскі пісьменнік Эрнэст

Хэмінгуэй, які шмат разоў бываў у Гаване. А культавы амерыканскі кінарэжысёр Олівер Стоўн пазней заўважыў, што Фідэль Кастра — адзін з «наймудрэйшых людзей на Зямлі, чалавек, да якога трэба звяртацца за парадамі».

НАСУПЕРАК БЛАКАДЗЕ

Цікава, што спачатку Фідэль быў гатовы да канструктыўных адносін з ЗША, аднак тыя асцерагаліся росту левых настрояў у Амерыцы і паставіліся да Кастра варожа. Больш таго, ЗША Востраў Свабоды насамрэч стаў як костка ў горле. Кубінцам удалося сарваць аперацыю Штатаў у заліве Свіней у красавіку 1961 года, годна абараніўшы заваёвы сацыялістычнай рэвалюцыі. Практычна Востраў Свабоды на доўгія дзесяцігоддзі апынуўся ў асадным становішчы (чаго вартыя, напрыклад, 637 (!) замахаў на жыццё Фідэля). Галоўным саюзнікам Кубы стаў СССР.

Пасля перамогі рэвалюцыі было прынята рашэнне аб рэфармаванні эканомікі і нацыяналізацыі банкаў, крэдытна-фінансавых арганізацый, а таксама шэрагу прамысловых прадпрыемстваў, зямлі і іншай уласнасці, якая належала замежным (перш за ўсё — амерыканскім) карпарацыям і прыхільнікам Батысты. Ужо да сярэдзіны 1961 года быў створаны дзяржаўны сектар эканомікі, які ўключаў у сябе дзяржаўную банкаўскую сістэму, дзяржаўную манаполію на вядзенне знешняга гандлю, 90% прамысловых прадпрыемстваў, 41% зямель сельскагаспадарчага прызначэння (у складзе народных маёнткаў і кааператываў), значную частку транспарту і ўнутранага гандлю.

У перыяд пасля 1960 года каласальны ўрон эканамічнаму развіццю Кубы нанесла блакада, усталяваная ўрадам ЗША. Па афіцыйных даных урада Кубы, па стане на пачатак снежня 2010-га прамая шкода склала $104 млрд (з улікам абясцэньвання долара ў адносінах да золата ў перыяд пасля 1961-га ўвогуле атрымліваецца астранамічная сума — $975 млрд). Тым не менш, была створана надзейная прамысловая база, а таксама арганізавана дзейсная сацыяльная сістэма. Апошняя, дарэчы, насамрэч дасягнула сусветнага ўзроўню. Кубінская сістэма аховы здароўя (разам з фармацэўтыкай) і адукацыі — прыклад для іншых. Так, па індэксе чалавечага развіцця і паказчыку дзіцячай смяротнасці Востраў Свабоды перасягае многія развітыя краіны.

«ПЕРАЗАГРУЗКА» САЦЫЯЛІЗМУ

Цяпер на Кубе адбываецца «будаўніцтва новай сацыяльна-эканамічнай мадэлі». Па сутнасці, гаворка ідзе аб праграме кшталту савецкага НЭПу. Дапускаюцца розныя формы ўласнасці пры перавазе дзяржаўнай. У кастрычніку 2010 года ўрад Кубы дазволіў прадпрымальніцкую дзейнасць. Рауль Кастра (Фідэль з 2008-га па стане здароўя адышоў ад спраў, але, канешне ж, яго меркаванне заставалася надзвычай аўтарытэтным) звярнуўся да суграмадзян з заклікам падтрымаць яго радыкальную праграму эканамічных змен, заявіўшы, што «будучыня рэвалюцыі вісіць на валаску». Паводле яго слоў, рэформы, якія прадугледжваюць значнае павелічэнне ролі прыватнага прадпрымальніцтва, накіраваны на выратаванне сацыялістычнага ладу, а не на вяртанне да капіталізму. У канцы мая 2016 года ўлады Кубы абвясцілі аб легалізацыі прыватных прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу.

На долю сельскай, лясной гаспадаркі і рыбалоўства прыпадае 5% ВУП (у гэтых галінах занята 25% працоўнай сілы), прамысловасці і будаўніцтва — 34% (24% эканамічна актыўнага насельніцтва), сферы паслуг — 58%. Куба валодае значнымі прыроднымі рэсурсамі, сярод якіх — нікель (другое месца па запасах у свеце), кобальт (пятае месца), адкрыты радовішчы нафты і газу. Важнай крыніцай даходу з'яўляецца міжнародны турызм. Самы вялікі з усіх Карыбскіх астравоў — востраў Свабоды — заўсёды прыцягваў замежных гасцей. Так, калі ў 2000 годзе Кубу наведалі больш чым 1,7 млн турыстаў, то ў 2012-м — ужо 2,7 млн, а летась — 3,5 млн (рэкордная колькасць). Па выніках мінулага года атрымана $2,8 млрд даходаў ад турыстычнага бізнесу, на гэты сектар прыходзіцца 10,1% ВУП краіны.

Міністр знешняга гандлю і інвестыцый Кубы Радрыга Мальміеркам заявіў на Гандлёвым кірмашы — 2016 у Гаване аб жаданні кубінскага ўрада прыцягнуць укладанні з-за мяжы. «Замежныя інвестыцыі неабавязкова з'яўляюцца злом, гэта важны элемент сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны», — сказаў міністр. Падчас кірмашу было прэзентавана 395 інвестыцыйных праектаў, якія ў суме ацэньваюцца ў $9,5 млрд. У 2014 годзе кубінскія ўлады ініцыявалі прыняцце новага інвестыцыйнага закона, дзякуючы якому ўдалося запусціць 83 праекты з замежным удзелам коштам у $1,3 млрд. 15 з гэтых праектаў дзейнічаюць у Кубінскай асаблівай эканамічнай зоне ў Марыела.

Цяпер некалькі штрыхоў да палітычнай перспектывы. Сёлета ў красавіку Фідэль Кастра не толькі ўзяў удзел у пасяджэнні з'езда кубінскай Кампартыі, але і выступіў перад дэлегатамі з прамовай. «Хутка я пайду за ўсімі, бо кожнаму з нас калісьці пара сыходзіць, — сказаў ён тады. — Але ідэі кубінскіх камуністаў будуць жыць вечна».

Красамоўнай атрымалася адна са сцэн падчас візіту Барака Абамы на Востраў Свабоды. Пасля чарговага публічнага мерапрыемства ў Гаване Абама паспрабаваў пакласці руку на плячо Рауля Кастра. Рауль, нягледзячы на імкненне нармалізаваць адносіны з Вашынгтонам, руку Абамы перахапіў і дэманстратыўна падняў яе над галавой. Куба прыкладна гэтак жа насцярожана ставіцца да любых намёкаў на тое, што ЗША і сілы «сусветнага капіталу» выйграюць у барацьбе ідэалогій. Так што Востраў Свабоды свайго асаблівага месца ў сусветным раскладзе мяняць не збіраецца. Прынамсі, пакуль.

Захар БУРАК. *burak@zviazda.by*

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў шчырыя спачуванні і пажаданні стойкасці і мужнасці старшыні Дзяржаўнага савета і Савета Міністраў Кубы Раулю Кастра Русу, а таксама народу Кубы ў сувязі са смерцю лідара Кубінскай Рэвалюцыі Фідэля Кастра Руса, паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе беларускага лідара.

«З надзвычай глыбокім смуткам даведаўся пра смерць майго Сябра і Вашага Брата», — адзначаецца ў спачуванні. «Фідэль Кастра назаўжды ўвайшоў у гісторыю як палымяны патрыёт, які прысвяціў сваё жыццё самаадданаму служэнню Радзіме і ідэалам Кубінскай Рэвалюцыі. З'яўляючыся кіраўніком невялікай карыбскай дзяржавы, ён стаў палітычным дзеячам планетарнага маштабу, які аказаў значны ўплыў на развіццё падзей у свеце ў XX стагоддзі і на перспектыву», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. Паводле яго слоў, паслядоўная дзейсная дзейнасць Фідэля Кастра стала каталізатарам фарміравання такіх адметных рыс кубінскага народа, як любоў да свабоды і гатоўнасць цвёрда адстойваць свае погляды.

«Для ўсіх нас і міжнароднай супольнасці яго вялікая асоба застанецца прыкладам непахіснага і сумленнага чалавека, сапраўднага народнага і нацыянальнага лідара, яркім прыкладам для паплечнікаў і паслядоўнікаў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — У Беларусі вельмі высока цэняць выключныя намаганні і важкі ўклад Фідэля Кастра ў развіццё двухбаковых адносін паміж нашымі краінамі. Яго светлае імя залатымі літарамі ўпісана ў гісторыю станаўлення беларуска-кубінскага стратэгічнага партнёрства».

«Мой дарагі Сябар Фідэль да апошніх дзён свайго жыцця працягваў нястомную працу на карысць грамадзян Кубы і брацкіх народаў. Вялікую каштоўнасць маюць для мяне разумныя думкі і парады, якімі ён дзяліўся са мной. Упэўнены, што гэты неацэнны скарб будзе і далей дапамагаць мне ў дзяржаўнай дзейнасці і асабістым жыцці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Звяртаючыся да Рауля Кастра, ён адзначыў: «Рауль, мы страцілі не толькі роднага і дарагога чалавека, мы страцілі мысліцеля, замены якому пакуль няма!»

КАМАНДАНТЭ Ў БЕЛАРУСІ

Сорак чатыры гады таму рэдактар газеты «Звязда» тэрмінова выклікаў да сябе маладога фотакарэспандэнта:

— Табе даручана разам з невялікай групай журналістаў суправаджаць таварыша Фідэля Кастра. Заўтра ён прылятае ў Мінск. Давай, дзейнічай...

Гэтым фотакарэспандэнтам быў я.

Столькі часу прайшло, але і сёння выразна памятаю не толькі сваё ўласнае хваляванне, але і падобны стан усіх, хто быў побач з легендарным Камандантэ. Уражвала энергетыка яго голасу, рухаў, знешнасці. Да дробязей памятаю адзін з самых яскравых, на мой погляд, эпізодаў візіту Фідэля, калі той прыехаў да Кургана Славы каля аўтастрады Мінск—Масква.

За некалькі гадзін да прыезду Фідэля зялёны лужок паміж Курганам і аўтастрадай пачалі запаўняць жыхары суседніх вёсак і пасёлкаў. Сустракаць кіраўніка свабоднай Кубы яны прыйшлі са сцягамі, транспарантамі. На грудзях людзей сталага веку зіхацелі баявыя і працоўныя ўзнагароды. Менавіта іх здалёку разгледзеў Фідэль Кастра, калі па бетонных прыступках падняўся наверх да бліскучых штыкоў абеліска. Далей адбылося тое, чаго не прадбачылі арганізатары. Легендарны Камандантэ павітаў ветэранаў узмахам рукі, а потым рашуча пераступіў праз бар'ер і напрамкі, па мокрым пасля дажджу схіле велічнага Кургана, пакрочыў да натоўпу людзей. Апрануты па-вайсковаму, у высокіх шнураваных чаравіках, ён спрытна адолеў спуск і праз хвіліну быў побач з ветэранамі.

За мінулыя сорак чатыры гады я шмат каму расказваў пра гэты маленькі штрых да партрэта чалавека, вядомага на ўсёй планеце. Мае суразмоўцы зноў і зноў сыходзіліся на тым, што той учынак быў праявай навышэйшай шчырасці і павагі легендарнага Фідэля да гераічнага беларускага народа.

Гэты здымак быў зроблены мной у той дзень, у момант размовы Фідэля Кастра з Пятром Міронавічам Машэравым.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

■ Разумныя грошы

ЗАХАВАЦЬ І «НАВАРЫЦЦА»

Калі наш рубель стабільны — іншая валюта «адпачывае»

Фінансісты любой краіны свету ўпэўнены, што грошы павінны працаваць нават тады (менавіта тады), калі поспехі ў эканоміцы не такія відавочныя... Зберажэннямі трэба проста правільна кіраваць. Як гэта рабіць — тут кожны выбірае свой алгарытм.

Без эмоцый

Стабільная нацыянальная валюта — гэта тое, чаго мы чакалі, аднак... На выхадных мне патэлефанавалі адразу трое сяброў, якія пыталіся парад наконт выкарыстання свабодных зберажэнняў. Ці мэтазгодна сёння ісці ў банк па замежную валюту або, наадварот, «скідваць» долары?

Бегчы ў абменнік я не параіў бы ў любым выпадку, бо прымаць сур'ёзныя рашэнні трэба з халоднай галавой. Аднак трымаць свабодныя грошы трэба абавязкова на рахунку або ў каштоўных паперах у банку, бо менавіта там яны не проста захоўваюцца, але і прыносяць даход. У далейшых падліках паспрабуем разабрацца ва ўзроўнях даходаў па розных схемах фінансавых укладанняў.

Дэпазіт у валюце — да 4%

Максімальная працэнтная стаўка па валютным дэпазіце ў камерцыйных банках цяпер складае да 4% гадавых. Такая стаўка прапануецца па дэпазітах з вялікім тэрмінам захоўвання (ад 18 месяцаў да 3 гадоў), аднак такі ўклад будзе безадзыўны — датэрмінова зняць свае грошы з яго немагчыма. Існуюць у банкаў і больш гнуткія прапановы з невялікім тэрмінам захоўвання. Напрыклад, прапануецца безадзыўны ўклад на 7 месяцаў пад 3,8% гадавых. Тут тэрмін значна меншы, а даход амаль такі ж.

Аднак гэтыя 3,8% гадавых фінансавая ўстанова абяцае толькі першыя 3 месяцы ўкладу, а потым стаўка становіцца плаваючай. Магчыма, што ў наступныя 4 месяцы даходнасць укладу можа быць паменшана ў аднабаковым парадку на сур'ёзную велічыню. І ў гэтым выпадку зрабіць ужо нічога нельга, бо ўклад таксама з'яўляецца безадзыўным.

Існуюць у банкаў і **адзыўныя ўклады**, але максімальная стаўка ў памеры 3% гадавых па іх прадугледжана пры тэрміне захоўвання 2 гады. Трэба разумець, што нават па адзыўных укладах банк не вітае датэрміновае зняцце грошай. У падобнай сітуацыі фінансавыя ўстановы звычайна прадугледжваюць зніжаную працэнтную стаўку, якая можа быць усяго 0,5-1% гадавых ці нават менш.

Каб не разгубіцца ў нюансах гэтых працэнтаў, спецыялісты раяць звяртаць увагу на памер эфектыўнай працэнтнай стаўкі і непасрэдна ўдакладняць у банках умовы штрафных санкцый пры датэрміновым зняцці ўкладаў. Дарэчы, максімальны памер гэтай самай эфектыўнай стаўкі ў большасці камерцыйных банкаў сёння не бывае большым за 3% гадавых.

Што тычыцца найбуйнейшых дзяржаўных банкаў, то тут даходнасць валютных дэпазітаў на маленькія тэрміны захоўвання (звычайна на 95 дзён) увогуле складае ад 1,3% да 1,4%. Па дэпазітах на кароткія тэрміны прапануюцца нефіксаваныя працэнтныя стаўкі.

На аблігацыю — 5%

Альтэрнатывай цяпер могуць стаць дакументарныя валютныя аблігацыі на прад'яўніка. Яшчэ летась падобныя каштоўныя паперы мелі даходнасць 5,5% гадавых пры тэрміне абарачэння 1,5 года. Сёння каштоўныя паперы прапануюцца з даходнасцю 5% гадавых. Тэрмін абарачэння складае ад 2,5 да 3 гадоў з магчымасцю датэрміновага пагашэння праз 18 месяцаў. Самае цікавае ў гэтай схеме тое, што пры датэрміновым пагашэнні выплачваецца і намінал паперы ў валюце, і неатрыманы даход (5% гадавых) на дату датэрміновага пагашэння. Мінімальны кошт такіх аблігацый складае тысячу долараў, а працэнты выплачваюцца праз кожныя 3 месяцы.

Новы прадукт на фінансавым рынку нашай краіны — **інтэрнэт-аблігацыі** для фізічных асоб, якія рэалізуюцца ў сістэме «Інтэрнэт-банкінг». Яны эмітаваныя ў бездакументарнай форме (гэта значыць, у выглядзе запісаў на рахунках аналагічна безнаяўным грашам) і з'яўляюцца «сучаснай версіяй» традыцыйных папяровых аблігацый.

Спецыялісты фінансавага рынку адзначаюць, што інтэрнэт-аблігацыі маюць шэраг пераваг не толькі ў параўнанні з дакументарнымі каштоўнымі паперамі, але і з банкаўскімі дэпазітамі. Прадавацца інтэрнэт-аблігацыі будуць да 30 верасня 2017 года, а тэрмін абарачэння іх заканчваецца 1 красавіка 2018 года. Намінальны кошт віртуальнай паперы складае 100 долараў, даход — 5% гадавых. Кліент за адзін раз можа набыць не больш за 500 аблігацый на суму 50 тысяч долараў.

Сярод плюсоў новага прадукту: магчымасць набываць аблігацыі кругласутачна, не выходзячы з дома; купляць іх як за валюту, так і за беларускія рублі, а таксама атрымліваць даход па купонах і сумы пагашэння без наведвання банка. Не існуе камісій пры куплі аблігацый і атрыманні даходу па іх, бо прадугледжана бясплатнае і дыстанцыйнае адкрыццё рахунку «дэпо» ў дэпазітарыі банка для захоўвання набытых папер. Па аналогіі з аблігацыямі на прад'яўніка, віртуальныя каштоўныя паперы не абкладаюцца падаходным падаткам.

Па новым прадукце ёсць адзін нюанс. Пры набыцці папяровых аблігацый у банку ад кліента пашпарт не патрабуюць. Давай грошы і атрымлівай аблігацыю на прад'яўніка. З інтэрнэт-аблігацыяй сітуацыя крыху іншая. Адкрыццё спецыяльнага рахунку ў дэпазітарыі банка ажыццяўляецца на канкрэтную асобу. У гэтым выпадку банк (а магчыма, і іншыя органы) будзе дакладна ведаць персанальную інфармацыю пакупніка. Калі ў кліента грошы ад легальных даходаў, то гэты нюанс яму «да лямпачкі».

Рублёвы дэпазіт — да 20%

Па беларускіх рублях выбар у кліентаў значна большы. Усе невялікія камерцыйныя банкі прапануюць досыць высокія працэнты (да 20%) у тым выпадку, калі ўклад адкрываецца на вялікі тэрмін (ад 12 месяцаў і больш). З максімальнымі працэнтамі і ў рублёвым сектары дэпазіты павінны быць безадзыўнымі. Больш таго, гэтая стаўка будзе не зусім фіксаваная, бо банкі падстрахоўваюцца формулай даходнасці (СР+2%). У гэтым выпадку СР — стаўка рэфінансавання Нацбанка (18%), якая можа памяншацца. Па дэпазітах на невялікі тэрмін захоўвання (да 6 месяцаў) банкі прапануюць стаўку да 12%-13%.

Ёсць выключэнні. Напрыклад, асобныя прыватныя банкі прапануюць нават на 150 дзён стаўкі, вышэйшыя за сярэднярынкавыя (17%-18%), але тут трэба ведаць, што яны абавязкова будуць плаваючымі. Больш таго, па такіх дэпазітах датэрміновае зняцце грошай не прадугледжваецца ні пры якіх абставінах.

Можна адшукаць уклад і на 95 дзён, за якія ўладальнік дэпазіту атрымае стабільныя 17%. Пры пралангацыі падобных укладаў працэнтная стаўка зніжаецца ў разы. На гэта банкі і разлічваюць, калі прапісваюць у дагаворы аўтаматычнае перазаключэнне ўкладу, бо кліент часта не забірае грошы менавіта ў вызначаны тэрмін. Пасля ж пралангацыі ўкладу на новых умовах датэрміновае зняцце грошай не прадугледжваецца. У гэтых выпадках, калі ўкладчык своечасова не зняў свае накапленні, то вымушаны чакаць яшчэ адзін тэрмін, але з мінімальнай даходнасцю.

Фіксаваны даход па ўкладах традыцыйна прапануюць самыя буйныя банкі краіны, але і даходнасць там крыху меншая. На невялікія тэрміны захоўвання фіксаваныя стаўкі па дэпазітах складаюць 10%-12%.

Некаторыя банкі прапануюць тэрміновыя банкаўскія ўклады, якія адкрываюць для кліентаў магчымасць кіравання ўласнымі зберажэннямі праз інтэрнэт з выкарыстаннем сваёй банкаўскай плацежнай карткі. Сярод пераваг падобнай прапановы — адкрыццё і кіраванне ўкладам без наведвання структурнага падраздзялення банка і вяртанне ўкладу шляхам пераводу рэшткаў грашовых сродкаў з налічанымі працэнтамі на банкаўскую картку.

Калі чалавек выбірае тэрмін укладу, то ён павінен памятаць, што па новых дагаворах падаходным падаткам будзе абкладацца даход па ўкладах, калі тэрмін фактычнага размяшчэння грашовых сродкаў на рахунках складае менш за адзін год у беларускіх рублях або менш за два гады ў замежнай валюце.

Галасуем за рубель

Эксперты фінансавага рынку адзначаюць, што сёння захаванне грашовых сродкаў менавіта ў нацыянальнай валюце на банкаўскіх рахунках больш выгаднае, чым па лініі розных ашчадных механізмаў у замежнай валюце. Паводле прагнозаў спецыялістаў, у беларускага рубля чакаецца працяглая паласа раўнавагі. Дадатковым фактарам захоўвання сродкаў у беларускіх рублях эксперты лічаць упэўненыя прагнозы Нацбанка аб утрыманні інфляцыі на працягу 2016 года ў межах 12% і яе памяншэнні налета. Калі гэтыя прагнозы спраўдзяцца, то і курс замежнай валюты застанецца стабільным. У гэтым выпадку рублёвыя дэпазіты стануць істотна больш выгаднымі за валютныя.

Цяпер даходнасць па ўкладах не такая высокая, якая была ў пачатку года, але банкі імкнуцца прывабіць укладчыкаў не толькі працэнтнымі стаўкамі. Напрыклад, магчымасцю часткова здымаць грошы без страты працэнтаў, адкрыць дэпазіт пры дапамозе інтэрнэт-банка, свабодна папаўняць уклад і атрымаць у падарунак міжнародную картку. А яшчэ, банкі прапануюць кліентам невялікія працэнты па дэпазітах, бо толькі ў гэтым выпадку яны змогуць прапанаваць нам жа танныя крэдыты.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Тэхналогіі

ПЛАСТЫК ЗАМЯНЯЕ ПАПЕРКІ

Мінчанін можа атрымаць электронную картку медыцынскага абслугоўвання хоць сёння

Аўтаматызацыя ахапіла ўсе медустановы сталіцы. Напярадзе — паліклінікі, крыху адстаюць стацыянары. У рэгіёнах працэс адбываецца павольней (груба кажучы, працоўныя месцы паловы ўрачоў яшчэ не забяспечаны камп'ютарамі), але справа рухаецца. Калі дакладна завершыцца, сказаць пакуль цяжка — усё ўпіраецца ў дастатковае фінансаванне.
Грошы з бюджэту працягваюць выдаткоўвацца на закупку абсталявання, пракладванне лакальных сетак, аплату праграмнага забеспячэння і паслуг, лініі сувязі і інтэрнэт. Пры адкрыцці новых устаноў аховы здароўя ў сталіцы імкнуцца адразу правесці інфарматызацыю ўсіх працоўных месцаў — і ўрачоў, якія вядуць амбулаторны прыём, і ўсіх службаў, у тым ліку дыягнастычных, каб у рэжыме анлайн урач мог адразу азнаёміцца з вынікамі розных даследаванняў.

У першую чаргу трэба гаварыць, што ў рабочым камп'ютары ўрача знаходзіцца ўжо ўся інфармацыя аб пацыентах. Захоўваюцца звесткі на лакальных серверах. Папяровая амбулаторная картка, якую ўрач павінен запаўняць ад рукі, заканадаўствам не адменена таксама, але ж цяпер у сталіцы ўжо ніхто нічога не піша — набіраюць на камп'ютары, друкуюць, падпісваюць і прыклейваюць. Яшчэ гадоў пяць і гэты стос склееных паперак адамрэ. Будучыня, вядома, за электронным варыянтам — ён эканоміць час урача і пацыента, забяспечвае ўзаемадзеянне паміж урачамі. Электронная картка медыцынскага абслугоўвання — гэта звычайная пластыкавая картка з унікальным штрых-кодам, які забяспечвае доступ да інфармацыі пры яго счытванні. Але ніякай інфармацыі на самім пластыку няма — гэта проста метад ідэнтыфікацыі. Каштуе картка 24 капейкі, але пацыент нічога не аплачвае, закупку ажыццяўляе Белфармацыя. У сталіцы ўжо ўсе паліклінікі актыўна заказваюць пластыкавыя карткі, аднак пакуль пацыенты марудзяць з іх атрыманнем. Так, ёсць магчымасць выдаць і дарослым, і дзецям больш за 700 тысяч картак, а выдадзена менш за 300 тысяч. Між тым дастаткова толькі пры звароце ў паліклініку прад'явіць пашпарт. Па краіне выбрана пакуль 28 паліклінік для правядзення такой работы. Усе медустановы плануецца ахапіць у 2018-м. Трэба мець на ўвазе, што карткі медабслугоўвання — з'ява часовая, ім на змену праз нейкі час павінны прыйсці электронныя пасведчанні асобы для ідэнтыфікацыі, адзначае **кіраўнік аддзела арганізацыйна-метадычнага і сістэмна-тэхнічнага суправаджэння інфарматызацыі аховы здароўя Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, упраўлення і эканомікі аховы здароўя Сямён ПАЛЯКОЎ.**

З мінулага года актыўна ўкараняўся ў Мінску і электронны рэцэпт. Паступова ўсе медцэнтры і аптэчныя арганізацыі незалежна ад формы ўласнасці будуць працаваць з электроннымі рэцэптамі. У электронным выглядзе выпісваюцца ў тым ліку і льготныя рэцэпты. Але ўсе дубліруюцца папяровым аналагам. Дарэчы, магчымасць выпісвання паперкі не адменена нідзе ў свеце, дзе ёсць электронныя рэцэпты, хоць асабліва ніхто ёю і не карыстаецца. Укараненне электроннага рэцэпта паскорыла працэс атрымання правізарам той інфармацыі, якую ўрач адправіў з працоўнага месца на сервер. Каб убачыць рэцэпт, правізару дастаткова з дапамогай свайго камп'ютара счытаць штрых-код з пластыкавай карткі пацыента. Інфармацыя пры гэтым можа адпраўляецца і ў адваротным накірунку — ад правізара да ўрача. Увядзенне электронных картак паскорыла работу электронных чэргаў, з іх дапамогай можна і талон заказаць або адмяніць. Пры электронным заказе талона на мабільны тэлефон пацыенту прыходзіць SMS-паведамленне з поўнай інфармацыяй аб тым, на якое чысло, да якога ўрача і г. д. вам трэба прыйсці. Каб пацвердзіць візіт, націскаеце прапанаваную лічбу.

Фота БЕЛТА.

Сусветны банк рэканструкцыі і развіцця выдаткоўвае каля 125 млн долараў на развіццё сістэмы электроннай аховы здароўя, у тым ліку на ўкараненне электроннай медыцынскай карткі. У перспектыве яна будзе не толькі папаўняцца нейкімі новымі звесткамі цягам усяго жыцця пацыента — гэта і магчымасць стварэння асабістага кабінета з абмежаваннем доступу да сваёй асабістай інфармацыі. Акрамя таго, размова ідзе пра будаўніцтва і аснашчэнне сучасных вучэбных цэнтраў з манекенамі, падобнымі на жывога чалавека, для адпрацоўкі самых розных навыкаў аказання меддапамогі. Праект стартуе ў наступным годзе, а завершыцца ў 2021-м.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

■ Трагедыя

«Градус» бяды

У здзяйсненні ДТЗ у Ляхавіцкім раёне падазраецца выконваючы абавязкі начальніка гарадской ДАІ.

У суботу вечарам на трасе, якая праходзіць праз вёску Дарава, адбылася аварыя са смяротным зыходам. Інспектары спынілі аўтамабіль, на вадзіцеля якога складалі пратакол за парушэнне правілаў. Жанчына-пасажыр, якая ехала ў машыне, выйшла, каб нешта ўдакладніць у супрацоўнікаў з патрульнай машыны. Калі яна пераходзіла праезную частку, яе збіў іншы аўтамабіль. 36-гадовая жыхарка Слуцка загінула на месцы. У яе засталося двое дзяцей.

За рулём машыны, якая здзейсніла наезд на чалавека, знаходзіўся часова выконваючы абавязкі начальніка ДАІ Баранавіцкага гарадскога аддзела ўнутраных спраў. Афіцэр міліцыі быў у гэты час не на службе, ён ехаў на сваім аўтамабілі, і як высветлілася, знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення.

У панядзелак стала вядома, што Следчым камітэтам краіны ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да выконваючага абавязкі начальніка Баранавіцкай ДАІ, які падазраецца ў здзяйсненні дарожна-транспартнага здарэння, што пацягнула за сабой смерць чалавека. Падазраваны затрыманы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

ООО «Юридическая компания Аспект» проводит ОТКРЫТЫЕ ТОРГИ в форме аукциона по продаже имущества ООО «Детская страна», находящегося в процедуре ликвидации

№ лота	Наименование лота	Начальная цена лота с учетом НДС, руб.	Шаг торгов, руб.	Задаток для участия в торгах, руб.
1	Подгузники 4-8 кг S Goo.n (84 шт)	18,04	0,90	1,80
2	Подгузники - трус. 9–14 кг L д/м Goo.n (44 шт)	18,04	0,90	1,80
3	Подгузники до 5 кг N/B Goo.n (90 шт)	18,04	0,90	1,80
4	Салфетки бумажн. + Water Elleair Ellear (180 шт)	2,10	0,11	0,21
5	Салфетки влажн. в пласт. коробке Goo.n (70 шт)	5,46	0,27	0,55
6	Подгузники - трус. 12-20 кг XL д/д Goo.n (38 шт)	18,04	0,90	1,80
7	Подгузники 6-11кг M Goo.n (64 шт)	18,04	0,90	1,80
8	Подгузники до 12-20 кг XL Goo.n (42 шт)	17,49	0,87	1,75
9	Подгузники - трус. Goo.n S 5–9 кг (62 шт)	16,50	0,83	1,65
10	Подгузники до 1,8–3 кг N/B Goo.n (36 шт)	10,62	0,53	1,06
11	Подгузники Goo.n MINIPACK M 6–11 кг (17 шт)	6,71	0,34	0,67
12	Салфетки влажные Goo.n (70 шт)	1,98	0,10	0,20

Торги состоятся 29.12.2016 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (-1 этаж). Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до 27.12.2016 г. включительно. Заявки принимаются по месту проведения торгов, а также по адресу: 220050, г. Минск, а/я 85

Реквизиты для оплаты задатка	Бенефициар – ООО «Детская страна» р/с № 3012156850017 в ОАО «Технобанк», г. Минск, ул. Кропоткина, 44, код 182, УНП 192503708

Условия торгов:

• к участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;

• лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка (задатков). При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:

- юр. лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом РБ): копии учредит. док-в вместе с выпиской из торгового реестра страны учреждения (выданной не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления), доверенность на представителя (документы подлежат легализации и нотариальному удостоверению с переводом на русский язык);

- ИП: свидетельство о госрегистрации с копией для заверения организатором аукциона;

- представителем гражданина Республики Беларусь, ИП: нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем иностранного физического лица, ИП (нерезиденты Республики Беларусь): легализованная доверенность с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;

• победителем признается участник торгов, предложивший за лот наиболее высокую цену;

• договор купли-продажи заключается в течение 10 (десяти) календарных дней со дня проведения торгов;

• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;

• победитель (единственный участник торгов) оплачивает цену лота за вычетом суммы внесенного задатка в течение 3 (трех) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи;

• в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, возмещения затрат на организацию и проведение торгов, подписания договора, а также в иных случаях, предусмотренных актами законодательства, внесенный этим участником задаток возврату не подлежит;

• в случае признания торгов несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо на торги явился единственный участник, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов.

Получить дополнительную информацию можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8(017) 2547741.

ПАЛЯЎНІЧА-ТУРЫСТЫЧНЫ КОМПЛЕКС АКЦЯБРСКАГА ЛЯСГАСА

ПРАПАНУЕ ПРАЖЫВАННЕ Ў ПАЛЯЎНІЧЫХ ДОМІКАХ З НАЧЛЕГАМ:

✓ **будныя дні (пятніца — чацвер) — 28 рублёў;**
✓ **выхадныя і святочныя дні (пятніца — нядзеля) — 42 рублі.**

Да паслуг гасцей паляўніча-турыстычнага комплексу — лазня, більярд.

Пры арэндзе домікаў паляўніча-турыстычнага комплексу арганізаванымі групамі на суткі **дзейнічае пакет «усё ўключана»:**

- ***да 6 чалавек*** (будныя дні — 140 рублёў, выхадныя дні — 210 рублёў);
- ***ад 7 да 12 чалавек*** (будныя дні — 180 рублёў, выхадныя дні — 260 рублёў);
- ***больш за 13 чалавек*** (будныя дні — 210 рублёў, выхадныя дні — 300 рублёў).

УНП 400008007

ДЛГУ «Акцябрскі лясгас», 247319, Гомельская вобласць, г.п. Акцябрскі, вул. Драпезы, 9
Тэл.: 8-02357-5-41-86, 8-02357-5-20-14.
http://oktleshoz.by; oktlesplho@mail.ru

РУП «Институт недвижимости и оценки» по поручению Октябрьского (г. Минска) межрайонного отдела Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества должника

ОПИСАНИЕ

Лот №1: Машиноместо № 22, расположенное по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, 4-22. Площадь – 14,8 кв.м, инв. № 500/D-661051. Начальная цена – 9909,90 бел. руб.* Задаток – 980,00 бел. руб.*

УСЛОВИЯ

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), ему присваивается статус «Претендент на покупку».
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан произвести оплату всей стоимости Объекта не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, обращённый в доход государства (имущество должника), осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 15.12.2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

Шаг аукциона – 5%.
Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества должника (Лот №1), **проводимом 15 декабря 2016 г.**
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений и задатков – **12.12.2016 в 12.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта аукциона по Лоту № 1: Приходько Глеб Анатольевич, (017) 380-41-59.
Организатор аукциона вправе снять лот с торгов по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 1012018 **считать недействительным.**

УНП 100122726

ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»

220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8, ком. 201.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА

Собрание состоится 12 декабря 2016 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 8, актовый зал общества.

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.30 до 14.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

Повестка дня:

1. Уменьшение уставного фонда ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» путем уменьшения номинальной стоимости акций.
2. Внесение изменений и дополнений в устав ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» и утверждение его в новой редакции.
3. Утверждение показателя по энергосбережению на 2016 год.

Лица, имеющие право на участие в собрании, могут ознакомиться с информацией (документами), подлежащей представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 5 декабря 2016 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в юридическом управлении ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» (220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Общество на основании решения Совета директоров от 24 ноября 2016 года для проведения внеочередного общего собрания акционеров определило дату формирования реестра акционеров – 25 ноября 2016 года.

Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».

УНП 100135676

ОАО «Амкодор-Дзержинск»

222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА

Собрание состоится 12 декабря 2016 г. в 15.00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, актовый зал Общества.

Орган, созывающий собрание:
Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск».

Регистрация участников Собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

Повестка дня:

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Амкодор-Дзержинск» за счет источников собственных средств.
2. Об изменении наименования ОАО «Амкодор-Дзержинск» без реорганизации.
3. О внесении изменений в устав и утверждении его в новой редакции.

Лица, имеющие право на участие в собрании, могут ознакомиться с информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 30 ноября 2016 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «Амкодор-Дзержинск» (222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

УНП 600005769 **Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск»**

Утерянные представительством Белгосстраха по Октябрьскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0556134, №0556135 **считать недействительными.**

УНП 100122726

Информация о формировании реестра владельцев ценных бумаг

Полное наименование и местонахождение акционерного общества	**ОАО «Элегант»** Минская область, г. Жодино, пр. Ленина, 22
Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров	Наблюдательный совет ОАО «Элегант» Протокол заседания № 34 от 25.11.2016 года
Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров	**01 декабря 2016 года**

УНП 600039318

28 декабря 2016 года в 13.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров

ОАО «НеоТрейдЗапад»

по адресу: г. Гродно, ул. Гаспадарчая, 8

Начало регистрации участников собрания – 12.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1) Внесение изменений и дополнений в Устав Общества.

УНН 500167057

Извещение о проведении открытого конкурса на право аренды рыболовных угодий

Кормянский районный исполнительный комитет (далее – Кормянский райисполком) доводит до сведения юридических лиц о проведении открытого конкурса на право аренды рыболовных угодий

фонда запаса Кормянского района – реки Сож 1 категории протяженностью 9 км от створного знака № 217 вверх по течению до створного знака 226 с прилегающим пойменным водоемом: (старик «Коротьковский» – площадью 28 га)

Срок договора аренды: 10 лет. Размер годовой арендной платы за рыболовные угодья составляет 247,8 руб. В дальнейшем размер ежегодной арендной платы за рыболовные угодья ежегодно уточняется областным исполнительным комитетом на основе индекса роста потребительских цен по отношению к декабрю предыдущего года.

Организатор конкурса – Кормянский райисполком.

Конкурс состоится «29» декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: г.п. Корма, ул. Ильющенко, 34, малый зал райисполкома. Окончательный срок приема документов: 26 декабря 2016 г.

Предварительно ознакомиться с расположением рыболовных угодий можно по адресу приема документов.

Документы принимаются по адресу: г. Корма, ул. Ильющенко, 34. каб. 110, тел. 8 02337 21368 (секретарь комиссии) с 9 до 13 часов, с 14 до 17 часов, кроме субботы и воскресенья.

Торги проводятся в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 мая 2015 г. № 451 «Об утверждении Положения о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса».

Участникам, не выигравшим конкурс, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после проведения конкурса.

Условия конкурса:

- создание и сохранение на период аренды не менее 5 рабочих мест;
- организация проката орудий рыболовства и маломерных судов;
- обустройство в течение года 2-х благоустроенных мест отдыха для рыбаков;
- наличие материально-технической базы, соответствующей профилю деятельности;
- осуществление деятельности в соответствии с Правилами ведения рыболовного хозяйства и рыболовства, утвержденных Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 г. № 580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими»;
- участник, выигравший конкурс, в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола комиссии возмещает Кормянскому райисполкому путем безналичного расчета платежным поручением затраты на организацию и проведение конкурса – сумму оплаты за публикацию в средстве массовой информации извещения о проводимых торгах.

Для участия в конкурсе необходимо представить следующие документы:

- заявление о предоставлении рыболовных угодий в аренду (далее – заявление), сведения о рыболовных угодьях, которые участники желают получить в аренду;
- проект договора аренды рыболовных угодий;
- копию карты-схемы (части карты-схемы) соответствующих рыболовных угодий с нанесенными границами;
- биолого-экономическое обоснование, согласованное с Министерством сельского хозяйства и продовольствия и территориальными органами Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды, или рыбоводно-биологическое обоснование, имеющее положительное заключение государственной экологической экспертизы и утвержденное Министерством сельского хозяйства и продовольствия;
- предложения в письменной форме о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте;
- доверенность представителя участника торгов и копию документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копию документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов;
- *заверенную банком копию платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка в областной бюджет в размере ежегодной арендной платы в сумме 247,8 рубля на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Гомельской области № 3600401001323 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск МФО 153001795, код назначения платежа 04004, УНП 400555165. Задаток вносится в срок не позднее 26 декабря 2016 г.*

Настоящее извещение размещено на официальном сайте Кормянского райисполкома: **http://korma.gov.by/**

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 6 (14)

■ Асцярожна!

ПАГРОЗА ПРЫХОДЗІЦЬ З ЛЕСУ

Чаму дзікі, ласі і лісы з'яўляюцца на гарадскіх і вясковых вуліцах, і што нясуць такія неспадзяваныя сустрэчы людзям і свойскім жывёлам?

У апошні час сюжэт у навінах пра шалёных жывёл не рэдкасць. Дзікія жывёлы могуць апынуцца на сельскім падворку і на гарадской вуліцы. Вось толькі паведамленні апошніх некалькіх месяцаў. Геаграфія здарэнняў — уся краіна.

ЛІСА, ВОЎК І КАПЫТНЫЯ ЗА КАМПАНІЮ

У вёсцы Фядоры Столінскага раёна мясцовыя жыхары ўбачылі лісу, якая відавочна прабіралася бліжэй да людзей. Лісу злавілі, перадалі яе ветэрынарам, па заключэнні якіх жывёла хварэла на шаленства. І хоць рыжая госця ні жывёл, ні людзей не пакусала, населены пункт тры месяцы быў пад узмоцненым кантролем ветэрынарнай службы.

А вось воўк у вёсцы Першамайск Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці напаў на людзей і свойскіх жывёл і пакусаў іх. Абясшкодзіў драпежніка старшакласнік. Усе людзі, пацярпелыя ад укусаў ваўка, былі неадкладна дастаўлены ў медустанову і атрымалі неабходную дапамогу, іх здароўю нішто не пагражае.

У вёску Гліняны Гродзенскага раёна зазірнула ліса. Яна хацела напасці на сабаку, але той яе задушыў. Пра інцыдэнт гаспадыня сабакі паведаміла ў ветслужбу. Экспрэс-аналіз паказаў, што ліса была шалёная. У вёсцы на два месяцы ўвялі ветэрынарны каранцін — правялі вакцынацыю дамашніх жывёл ды адлавілі бадзяжных.

Фота БЕЛТА

У гаражным кааператыве ў Савецкім раёне Гомеля лось пашкодзіў сем аўтамабіляў і параніў гараджаніна. На месца здарэння выклікалі ўчастковага міліцыянера. Яму давялося прымяніць зброю, і толькі стрэламі з аўтамата ўдалося забіць жывёлу. Як паказала экспертыза, лось быў заражаны шаленствам.

А ў Нясвіжы дзік шпацыраваў прама па горадзе. Гараджане паведамілі ў міліцыю аб нечаканым госці. Справа ўскладнялася тым, што дзік знаходзіўся недалёка ад дзіцячага садка, і міліцыянеру прыйшлося адагнаць жывёлу ў бязлюднае месца. Прымяніўшы табельную зброю, міліцыянер застрэліў яго. Як паказала экспертыза, дзік быў хворы на шаленства...

Атрымліваецца, што ад з'яўлення няпрошанага госця з лесу, які нясе небяспеку не толькі сваімі паводзінамі, але і тым, што можа заразіць кожнага смяротным вірусам, не застрахаваныя нават гараджане. Якія прыкметы шаленства жывёл, і што трэба рабіць людзям, калі ёсць верагоднасць, што побач хворая жывёла, — пра гэта мы распыталі спецыялістаў.

(Заканчэнне на 9-й стар.)

■ Сусветны вектар

Час дзейнічаць!

У найбліжэйшыя гады міжнароднай супольнасці неабходна прыкладаць намаганні для зніжэння аб'ёму выкідаў парніковых газаў, — адзначылі ўдзельнікі кліматычнага саміту ў Марока.

З 7 па 18 лістапада ў Маракешы (Марока) прайшла Першая сесія Канферэнцыі Бакоў, што дзейнічае ў якасці нарады Бакоў Парыжскага пагаднення, прымеркаваная да чарговай 22-й Канферэнцыі бакоў Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату. У рабоце Кліматычнай канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 25 тысяч дэлегатаў з 196 краін, у тым ліку міжнародныя, пазаўрадавыя, грамадскія арганізацыі. Гэта чарговы раз дэманструе, што праблема змянення клімату займае адзін з прыярытэтных кірункаў у большасці краін свету.

Як сказана ў сумеснай заяве ўдзельнікаў, у найбліжэйшай будучыні, асабліва ў наступныя 15 гадоў, міжнароднай супольнасці неабходна прыкладаць намаганні для зніжэння аб'ёму выкідаў парніковых газаў. Удзельнікі Канферэнцыі таксама паабяцалі дабівацца азелянення сваёй эканомікі, нарошчваць долю ўзнаўляльных крыніц энергіі ў агульным энергетычным балансе і прымаць меры па адаптацыі да наступстваў глабальнага пацяплення.

Па словах **начальніка аддзела міжнароднага супрацоўніцтва Мінпрыроды Марыны ФІЛІПЮК,** асаблівасцю 22-й Канферэнцыі бакоў Рамачнай канвенцыі аб змяненні клімату ААН было ўступленне ў сілу Парыжскага пагаднення і першая сесія краін — удзельніц гэтага пагаднення.

— Па стане на 20 лістапада дакумент ратыфікавалі 112 краін, адказных за 77% выкідаў (з Групы Дваццаці сярод іх няма толькі Расіі і Турцыі), і таму было вырашана на два гады скараціць час работы над «правіламі» і прыняць іх у канцы 2018 года на 24-й Канферэнцыі бакоў, — расказала Марына Філіпюк. — Правілы павінны ахоплівацъ розныя пытанні справаздачнасці і верыфікацыі даных, крытэрыі і працэдуры разгляду міжнародных праектаў, парадак падвядзення вынікаў глабальнай дзейнасці і інш.

Актыўны ўдзел у рабоце «кліматычнага саміту» прыняла і беларуская дэлегацыя на чале з міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэем Каўхутам.

Работа беларускай дэлегацыі праходзіла па многіх кірунках перагаворнага працэсу, уключаючы ўнясенне ў асноўныя дакументы канферэнцыі палажэнняў: аб паляпшэнні ўмоў перадачы найлепшых тэхналогій; ацэнцы патэнцыялу змякчэння ўздзеянняў на клімат кожнай краінай; неабходнасці ўліку асаблівай ролі тарфянікаў, водна-балотных угоддзяў і лясных экасістэм у паглынанні вугляроду; паляпшэнні патэнцыялу адаптацыі да змянення клімату ў кожнай краіне; доступе Беларусі да фінансавых рэсурсаў для прыняцця мер па змякчэнні ўздзеянняў на клімат і адаптацыі да яго змяненняў; уліку асаблівасцяў краін у галіне прадастаўлення фінансавай дапамогі, перадачы тэхналогій і інстытуцыянальнай сістэмы ўліку выкідаў.

— Вялікім дасягненнем дэлегацыі з'яўляецца ўключэнне ў афіцыйны праект рашэння Канферэнцыі па Зялёным кліматычным фондзе фармулёўкі, у адпаведнасці з якой краінам прапануецца накіроўваць свае меркаванні і рэкамендацыі, якія неабходна браць пад увагу пры распрацоўцы кіруючых указанняў для Зялёнага кліматычнага фонду штогод, не пазней за 10 тыдняў да пачатку Канферэнцыі, — адзначыла прадстаўнік Мінпрыроды.

Пасля заканчэння Канферэнцыі прадстаўнікі бакоў Парыжскага пагаднення павінны распрацаваць планы мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў гэтага дакумента. Згодна з адпаведнай пастановай Савета Міністраў ад 21 верасня 2016 года, Беларусь павінна завяршыць работу ў гэтым кірунку да 1 лютага 2017 года. Зараз Мінпрыроды плануе распрацаваць праект плана.

— Паколькі на міжнародным узроўні распрацоўка планаў, інструкцый, методык па Парыжскім пагадненні толькі пачынаецца, неабходна вельмі ўважліва, сур'ёзна і акуратна падысці да падрыхтоўкі нашага плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Парыжскага пагаднення, паралельна працуючы на міжнароднай перагаворнай кліматычнай арэне, — расказала **начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Мінпрыроды Таццяна ЕЎДАСЁВА.**

Больш падрабязна пытанне «Што неабходна зрабіць у Рэспубліцы Беларусь, працуючы над выкананнем палажэнняў Парыжскага пагаднення», будзе абмяркоўвацца ў межах аднайменнага «круглага стала», які пройдзе 29—30 лістапада 2016 года ў Мінску.

Вераніка КОЛАСАВА.
kolasava@zviazda.by

Парыжскае пагадненне, прынятае на 21-й сесіі Канферэнцыі бакоў Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату ў Парыжы 12 снежня 2015 года, падпісанае 22 красавіка 2016 года, увайшло ў сілу 4 лістапада 2016 года. Рэспубліка Беларусь стала паўнапраўным бокам Парыжскага пагаднення ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 верасня 2016 года №345.

■ Перспектывы

Узнаўляльным крыніцам — зялёны калідор

Адным з напрамкаў дзейнасці ў межах Парыжскага пагаднення з'яўляецца павышэнне ролі ўзнаўляльных крыніц энергіі: ва ўсім свеце яны павінны калі не замяніць поўнасцю, то зменшыць долю выкарыстання торфу, вугалю і іншых вычарпальных паліўных рэсурсаў. Якія змены ў гэтым накірунку плануюцца ў нашай краіне, расказалі спецыялісты.

Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Мінпрыроды Андрэя ПІЛІПЧУКА,** для мэт Парыжскага пагаднення прынята рашэнне аб тым, каб развітыя краіны фінансавалі нізкавугляроднае развіццё: павышэнне долі ўзнаўляльных крыніц энергіі, рэалізацыю інфраструктурных праектаў, якія датычацца адыходу ад высокавугляродных відаў паліва (мазуту, торфу, вугалю).

— Гэтыя стратэгіі краін гавораць пра тое, что сёння ва ўсім свеце зададзены зусім іншы, высокаэнергаэфектыўны і нізкавугляродны трэнд, — адзначыў Андрэй Піліпчук. — Сёння ўсе буйныя фінансавыя інстытуты ўключылі ў свой партфель кліматычны складнік як адзін з асноўных.

Сёння Міжнародная фінансавая карпарацыя працуе над стварэннем энергетычнай праграмы для краін Цэнтральнай Азіі і Еўропы, у тым ліку і для Беларусі. У яе тэхнічным заданні ўказана «разгледзець аб'ём фінансавання ў мадэрнізацыю буйных устарэлых энергетычных магутнасцяў у залежнасці ад аб'ёму ўкаранення ў краіне ўзнаўляльных крыніц энергіі».

— Гэта здаецца дастаткова дакладным пасылам — памер сродкаў, якія могуць паступіць ад стабільных і паспяховых донараў, будзе залежаць ад развіцця ў краіне ўзнаўляльнай энергетыкі, — сказаў Андрэй Сцяпанавіч.

Як паведаміў **начальнік аддзела навукова-тэхнічнай палітыкі і знешнеэканамічных сувязяў Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй МІНЯНКОЎ,** у параўнанні з 1990 годам энергаёмістасць ВУП у нашай краіне знізілася ў 3,3 раза, а доля ўласных энергарэсурсаў у паліўна-энергетычным балансе вырасла з 8,6 да 15,7%. У сферы ўзнаўляльнай энергетыкі дзейнічае больш за 3200 кацельных на драўняным паліве, 17 біягазавых установак, больш за 50 гідрастанцый і 50 ветраэнергетычных установак, а таксама 29 фотаэлектрычных («сонечных») станцый. Сёлета паказчык выкарыстання ўзнаўляльных крыніц энергіі ў валавым спажыванні складзе 5,7%, а ў 2020 годзе ён павінен вырасці да 6%.

Нягледзячы на поспехі ў гэтай сферы, нам ёсць куды яшчэ імкнуцца, упэўнены Андрэй Піліпчук. Калі на 2014 год энергаёмістасць ВУП Беларусі склала каля 0,19 тоны ў нафтавым эквіваленце на 1000 долараў ВУП, то сярэдняя велічыня гэтага паказчыка па краінах Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця — 0,13 тоны. Адстае наша краіна і па паказчыку вугляродаёмістасці: 0,41 тоны CO_2 на 1000 дол. ВУП супраць 0,20 тоны CO_2 на 1000 дол. ВУП у краінах АЭСР. Гэта адставанне вядзе да страты канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі на знешніх і ўнутраным рынках, — адзначыў прадстаўнік Мінпрыроды.

Вераніка КОЛАСАВА *kolasava@zviazda.by*

Ці патрэбная «зялёная» энергія насельніцтву?

Па словах Андрэя Мінянкова, у Аўстрыі арганізацыі і прадпрыемствы плацяць за выкарыстанне электраэнергіі менш за насельніцтва. Для буйнога бізнесу гэты тарыф складае 5-6 еўрацэнтаў за 1 кВт/гадзіну, для насельніцтва — 20—22 еўрацэнты за 1 кВт/гадзіну. Сабекошт жа выкарыстання ўзнаўляльных крыніц энергіі складае каля 8-9 еўрацэнтаў. Акрамя таго, фізічныя асобы могуць назапашваць электраэнергію ў акумулятарных установках ці па невялікіх тарыфах прадаваць яе ў агульную энергасістэму.

— У нас, на жаль, такой пабуджальнай сілы выкарыстоўваць УКЭ пакуль няма, бо ў Беларусі тарыфы для насельніцтва меншыя за тарыфы для юрыдычных асоб, — сказаў Андрэй Мінянкоў.

Але праз некаторы час сітуацыя можа змяніцца, калі, згодна з палажэннямі Стратэгіі развіцця энергетычнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь, тарыфы на энергію для насельніцтва будуць даведзены да ўзроўню 100-працэнтнага пакрыцця выдаткаў.

— Калі гэты паказчык вырасце да тых жа 8-9 цэнтаў, людзі пачнуць думаць, што ім больш выгадна: браць энергію з сеткі ці выпрацоўваць сваю з дапамогай узнаўляльных крыніц энергіі, а лішкі прадаваць. І гэта, на нашу думку, будзе галоўным стымулам для развіцця УКЭ ў прыватнай сферы, — патлумачыў Андрэй Піліпчук.

■ Абмяркоўваем разам

«ЗЯЛЁНАЯ» ДЭМАКРАТЫЯ

Чысты транспарт, экалагічная маркіроўка і сертыфікацыя, «зялёная» навука для чыноўнікаў — чаго чакаць ад новага Нацыянальнага плана па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай» эканомікі.

На пачатку лістапада адбыўся грамадскі сход з мэтай абмеркавання праекта Нацыянальнага плана дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай» эканомікі ў галінах народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь да 2020 года. Спецыялісты розных сфер, грамадскія дзеячы, прадстаўнікі экалагічных арганізацый выказалі распрацоўшчыкам Нацплана свае прапановы і заўвагі наконт законапраекта.

Экалогію — ва ўсе сферы

Падчас слуханняў **Наталля ЖАРКІНА, начальнік упраўлення аналітычнай работы, дзяржаўнай палітыкі і рэгулявання ў галіне аховы навакольнага асяроддзя Мінпрыроды,** прадставіла сам праект Нацыянальнага плана дзеянняў, расказала пра ход яго падрыхтоўкі, заўвагі і прапановы, якія паступілі:

— Праграма дзейнасці ўрада на 2016—2020 гг. сярод іншага вызначае неабходнасць развіцця «зялёнай» эканомікі, індустрыі, экалагічнага транспарту. У асноўных палажэннях праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця таксама растлумачана гэтая неабходнасць. Асноўнымі каардынатарамі сённяшняга праекта з'яўляюцца Мінпрыроды, Мінэканомікі і НАН Беларусі. Была створана міжведамасная рабочая група, у якую ўвайшлі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, некаторых грамадскіх аб'яднанняў і навукоўцы. На пасяджэнні прадставілі план-праект, які будзе дапрацаваны з удзелам грамадскасці.

На восьмай канферэнцыі міністраў аховы навакольнага асяроддзя, якая адбылася ў гэтым годзе ў Батумі, Беларусь выказала гатоўнасць выканання добраахвотных абавязкаў, накіраваных на стварэнне і развіццё інфраструктуры, «зялёнага» грамадскага гарадскога транспарту, прававых асноў па вядзенні арганічнай сельскай гаспадаркі, экалагічнай маркіроўцы тавараў, экалагічнай сертыфікацыі, сістэм кіравання навакольным асяроддзем, экалагічных стандартаў. Наша краіна пайшла па шляху экалагізацыі эканомікі. Мы павінны спыніць дэградацыю навакольнага асяроддзя і адначасова павялічыць дабрабыт насельніцтва. Для гэтага неабходна распрацаваць свой механізм дзеяння, вызначыць выразныя крытэрыі «зялёнай» эканомікі.

Наталля Іванаўна асобна звярнула ўвагу на сістэму «зялёных» закупак прадуктаў, якая загадвае набываць прадукты харчавання, тэхніку, канцтавары, паперу, тавары для рамонту, а таксама бытавую хімію з самымі лепшымі экалагічнымі характарыстыкамі. «Зялёныя» закупкі дапамагаюць клапаціцца пра здароўе людзей і стымулююць вытворчасць і спажыванне экапрадукцыі, зніжаючы ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Перавага аддаецца таварам з другаснай сыравіны або тым, якія можна перапрацаваць, а таксама прадукцыі з экамаркіроўкаю. На жаль, прадстаўнікі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю на сходзе адсутнічалі. Пытанне засталося адкрытым.

Адна з прапаноў аўтараў Нацплана: распрацаваць механізм, дзякуючы якому прадпрыемствы змаглі б атрымаць добраахвотны сертыфікат экалагічнай нейтральнасці. У далейшым ён можа быць выкарыстаны як абавязковы сертыфікат прадукцыі на міжнародным рынку, бо для яго атрымання неабходна выканаць шэраг патрабаванняў, якія знізяць антрапагеннае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Спадарыня Жаркіна таксама адзначыла неабходнасць развіцця электратранспарту ў краіне (наладзіць выпуск электробусаў — змешаны варыянт электрамабіля і аўтобуса — будучы прадукт «Белкамунмаша»). Закранула яна і тэму арганічнай сельскай гаспадаркі, заўважыла, што Мінсельгасхарч марудна падыходзіць да распрацоўкі юрыдычных аспектаў гэтага кірунку. У 2017 годзе ў краіне павінен з'явіцца закон аб арганічнай сельскай гаспадарцы, без прыняцца якога пакуль цяжка гаварыць пра падзаконныя механізмы і рабіць тыя ці іншыя высновы.

Нацплан прадугледжвае правядзенне інфармацыйных і адукацыйных мерапрыемстваў: плануецца ўвесці курс лекцый сярод чыноўнікаў праз Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Гэтай восенню ўжо стартаваў курс лекцый па «зялёнай» эканоміцы ў Беларускім эканамічным універсітэце.

Прысутныя дапоўнілі раздзелы праекта Нацплана практычнымі заўвагамі, а таксама заўвагамі рэдакцыйнага характару. Наталля Жаркіна выказала ўдзячнасць усім, хто прымаў удзел у абмеркаванні. Тым не менш яна нагадала, што неабходна ўлічваць канчатковую згоду — прапанову ў далейшым могуць і не прыняць.

Пасля грамадскіх абмеркаванняў заканатворцы селі за «круглы стол»: быў праведзены аналіз вопыту абмеркаванняў і спробы знайсці магчымыя шляхі яго ўдасканалення.

Слова — грамадскасці

У час слуханняў спецыялісты таксама правялі семінар па забеспячэнні эфектыўнага ўдзелу грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў у нашай краіне на практычным прыкладзе — на праекце Нацыянальнага плана дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай» эканомікі.

Па словах Таццяны ЕЎДАСЁВАЙ, начальніка аддзела інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Мінпрыроды, 1 ліпеня 2016 года пачаў дзейнічаць Закон Рэспублікі Беларусь ад 24.12.2015 №333-З «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і ўдзелу грамадскасці ў прыняцці экалагічна значных рашэнняў», у прыватнасці артыкул 15-2 «Грамадскія абмеркаванні праектаў экалагічна значных рашэнняў, справаздач аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе». Згодна з гэтым законам, механізм удзелу грамадскасці прадугледжвае: уцягванне грамадскасці на раннім этапе, інфармаванне грамадскасці належным чынам, разумныя тэрміны ўдзелу грамадскасці, забеспячэнне доступу да інфармацыі аб магчымасцях удзелу, доступ да інфармацыі, што тычыцца пытанняў, якія абмяркоўваюцца, забеспячэнне магчымасці прадстаўлення прапаноў і заўваг, доступ да інфармацыі аб канчатковым рашэнні.

Да пачатку сходу па абмеркаванні праекта Нацплана быў створаны «Збор заўваг і прапаноў па праекце ад прыватных асоб і арганізацый». Арганізатары адзначылі актыўны ўдзел у распрацоўцы дакумента ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў».

База шкодных выкідаў

Марына ЯНУШ, член сакратарыята Орхускай канвенцыі Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН, адзначыла неабходнасць стварэння цэнтралізаваных парталаў па абнародаванні экалагічнай інфармацыі з прадпрыемстваў. Вялікі вопыт у распрацоўцы падобных інтэрнэт-рэсурсаў маюць ЕС, Рэспубліка Малдова, спецыялізаваныя сайты існуюць у Славакіі, Румыніі. Такія парталы з інфармацыяй па пытаннях навакольнага асяроддзя зробяць экалагічную інфармацыю больш даступнай, дазволяць прыцягнуць да грамадскіх абмеркаванняў вялікую колькасць удзельнікаў. Акрамя таго, будзе распрацавана і абнародавана база даных аб выкідах забруджвальнікаў, інфармацыя аб некаторых вытворчых працэсах на прадпрыемствах (пры гэтым нельга забываць пра права прадпрыемстваў на канфідэнцыяльнасць інфармацыі, якая датычыцца спосабаў вытворчасці).

Каардынатар міжнародных праектаў БелНДЦ «Экалогія» Іван НАРКЕВІЧ адзначыў адказнасць цэнтра ў распрацоўцы тэхнічнай дакументацыі інтэрнэт-праекта.

— Мы павінны стварыць нацыянальны рэестр, даступную базу даных, якая будзе змяшчаць інфармацыю з прадпрыемстваў. Іншымі словамі, кожны чалавек зможа атрымаць звесткі аб выкідах з суседняга завода.

Апрача таго, ідэя сходу — мадэльнае слуханне. Напрыканцы мы створым модульны дакумент, які дасць аснову ўсім наступным слуханням. Такі сход — унікальны для навукоўцаў, юрыстаў, эканамістаў, эколагаў не толькі Беларусі, але і ўсяго свету.

Вольга ПРАЛЮК.
pralyuk@zviazda.by

■ Далучайцеся!

Паспрабуйце пачаць з сябе

Як «Экастарт» змяняе жыццё: гісторыі выпускнікоў

У гэтым годзе маладзёжны экалагічны цэнтр «Экастарт» адзначыў свой юбілей. На працягу пяці гадоў Цэнтр экалагічных рашэнняў праводзіць курсы для тых, хто неабыякавы да экалагічных праблем і хоча зрабіць свой побыт больш «зялёным».

Кожны год у сярэдзіне кастрычніка праходзіць набор у «Экастарт». Каб стаць удзельнікам, неабходна запоўніць анкету, па якой арганізатары ацэняць матывацыю жадаючых. На працягу сямі месяцаў праводзяцца заняткі для тых, хто прайшоў адборачны тур.

Вучоба для пятага набору пачалася ў лістападзе. З 91 заяўкі было прынята 47. Для параўнання: у 2014 годзе група складалася ўсяго толькі з 23 чалавек.

— З кожным годам да нас прыходзіць усё больш заявак, адпаведна, і адбіраць цяжэй, — расказала **Марыя РУДЗЬ (на фота), каардынатар і былая студэнтка «Экастарта».** — Мы стараемся даць шанц большай колькасці чалавек, таму і групы растуць. Радуе, што многія ўжо знаёмыя з экалагічнымі праблемамі. І наша школа для іх — гэта магчымасць знайсці аднадумцаў і рэалізаваць запланаваныя праекты. У гэтым годзе да нас хацеў прыйсці вучыцца хлопец пятнаццаці гадоў, у якога быў план па выратаванні возера. На жаль, мы не можам прымаць непаўналетніх. Але, спадзяёмся, ён не страціцца і захавае сваё жаданне рабіць навакольны свет лепшым.

Вопыт мінулых гадоў даказвае, што «Экастарт» цікавы як для тых, хто толькі пачынае спасцігаць асновы экалагічнай тэматыкі, так і для тых, хто імкнецца весці экалагічны лад жыцця. Акрамя лекцый па водных рэсурсах, энергазберажэнні, адходах і шматлікіх іншых тэмах, удзельнікаў чакаюць экскурсіі, майстар-класы, цікавыя заданні. Таксама кожны студэнт мае магчымасць рэалізаваць уласны экалагічны праект.

— Экалогія для мяне — гэта важлівае стаўленне да месца, дзе ты жывеш, і да самога сябе. Я думаю, што ніхто не захоча прыходзіць у дом, дзе паўсюль смецце і пыл. Ніхто не захоча і сам быць у гразі. Нават калі чалавеку ўсё роўна, у якім стане планета, яму ніколі не будзе ўсё роўна, у якім стане яго знешнасць. А без разумення экалагічнага ладу жыцця немагчыма быць прыгожым ні звонку, ні знутры. Зараз мае веды ў галіне экалогіі павярхоўныя. Таму я чакаю ад «Экастарту» карысных ведаў, якімі змагу карыстацца сама і перадаваць іншым, — падзялілася меркаваннем **Анастасія ХРЫШЧАНОВІЧ, новая ўдзельніца «Экастарту».**

«Экастарт» змяняе жыццё», — сцвярджаюць студэнты мінулых гадоў. Мы даведаліся ў выпускнікоў, якімі яны былі да школы і што змянілася пасля, якія праекты ім удалося рэалізаваць.

Карына МАЛІНОЎСКАЯ, праект «Экалагічныя майстэрні для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі», працуе з прыхільнікамі Цэнтра экалагічных рашэнняў:

— Да «Экастарту» мяне цікавілі больш глабальныя праблемы. Пасля яго я зразумела, што трэба пачаць з сябе. Людзі, якія думаюць, што адзін чалавек нічога не можа, памыляюцца. Такая простая рэч, як сартаванне смецця дома, — патрэбная і карысная справа. Акрамя ЦЭРа, я была валанцёрам і ў дзіцячым хоспісе, таму мне прыйшла ідэя арганізаваць экалагічныя мерапрыемствы для гэтых дзетак і шматдзетных сем'яў. Пры дапамозе Цэнтра экалагічных рашэнняў праект быў паспяхова рэалізаваны.

Павел КОЎШАЛЬ, арганізатар экапунктаў на розных фестывалях:

— На «Экастарт» я прыйшоў з мэтай разабрацца ў экалагічных праблемах, аб якіх меў павярхоўнае ўяўленне. І я атрымаў неабходныя веды. Але галоўнае — «Экастарт» дапамог зразумець, у якім кірунку я хачу рухацца далей. Акрамя гэтага, я пазнаёміўся з вялікай колькасцю аднадумцаў. А хто яшчэ можа натхніць на новыя актыўнасці? Вядома, «Экастарт» змяніў маё жыццё. Спачатку было вельмі цяжка псіхалагічна. Пастаянна трапляліся на вочы «экагрэхі», якія шкодзяць нашай планеце. Але складаней было бачыць іх нават не ў іншых людзях, а ў сабе. Прыйшлося шмат ад чаго адмовіцца. Аднак паступова прыйшло філасофскае стаўленне: немагчыма ўсё змяніць у адно імгненне, трэба ісці маленькімі крокамі. Думаю, з часам людзі зразумеюць, як трэба ставіцца да прыроды, а мы, экаактывісты, павінны ім у гэтым дапамагчы. Адсюль і мой праект — экапункты. Я хачу, каб людзі на розных фестывалях, святах не толькі адпачывалі, але і атрымлівалі карысную інфармацыю.

Лізавета РАМАНОЎСКАЯ, арганізатар «ВелаЭкаКвэста-2»:

— Пра «Экастарт» я даведалася на першым «ВелаЭкаКвэсце», дзе нас пазнаёмілі з экалагічнымі арганізацыямі Мінска. Маладзёжны цэнтр даў мне неабходную інфармацыю і сродкі для рэалізацыі задуманага праекта «ВелаЭкаКвэста-2». Ён праходзіў у прамысловым раёне Шабаны. Мае аднагрупнікі дапамаглі прыдумаць заданні і правесці гэтае мерапрыемства. «Экастарт» напоўніў маё жыццё яркімі падзеямі: «зялёныя» Каляды, выпускны на казінай ферме. Калі вас цікавіць насычанае жыццё — не прапусціце такую магчымасць, станавіцеся ўдзельнікамі «Экастарту»!

Калі вы не паспелі падаць заяўку на «Экастарт» у гэтым годзе, то ў вас ёсць шанц стаць удзельнікам маладзёжнага адукацыйнага цэнтра ў наступным. «Экастарт» можа змяніць і ваша жыццё!

Кацярына КІРЭЕВА

ПАГРОЗА ПРЫХОДЗІЦЬ З ЛЕСУ

Трапляючы ў населены пункт, хворыя на шаленства звяры часта заражаюць свойскіх жывёл.

ВІРУС ЛЮБІЦЬ ХОЛАД

Пераносчыкамі віруса шаленства з'яўляюцца дзікія жывёлы. Любая драпіна на целе здаровай дзікай жывёлы можа інфіцыравацца, бо вірус пэўны час жыццяздольны ў глебе, а таксама ў трупах памерлых ад шаленства дзікіх жывёл і не пахаваных належным чынам.

Трэба адзначыць, што ў Беларусі праводзіцца імунізацыя лясных звяроў пры дапамозе авіяцыі. З самалёта АН-2 раскідваюць прынаду — кармавы брыкет з вакцынай унутры. Аднак гэта не дае магчымасці прышчапіць усё пагалоўе лясных насельнікаў. Таксама варта ўлічваць, што ў халодны сезон вірус шаленства найбольш жыццяздольны (да трох месяцаў), пры цёплым надвор'і гіне на працягу некалькіх дзён, а пры высокіх тэмпературах (ад +55°С) — праз некалькі хвілін. Некаторыя шчолачныя растворы, а таксама кальцыніраваная сода здольныя забіць вірус за некалькі гадзін.

СІМПТОМЫ ХВАРОБЫ

Што датычыцца дзікіх жывёл, то класічная, добра вядомая кожнаму прыкмета захворвання — звер ідзе да людзей, што ў норме для яго не характэрна. Але сімптомаў хваробы значна больш. **Кансультант-дзяржветінспектар упраўлення кантролю за супрацьэпізаатычнай работай Дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей ДАМБРОЎСКІ** расказаў, што вылучаюцца тры формы праявы шаленства: буйная, ціхая і атыповая. Буйная форма працякае ў некалькі стадый. На першай жывёла хаваецца ў цёмным месцы ад людзей ці, наадварот, вельмі цягнецца да іх. Магчыма праява свербу на месцы ўкусу. На другой стадыі з'яўляецца агрэсія. Нарастае хваляванне, хрыплы брэх, схільнасць да з'ядання іншародных прадметаў, нападе на іншых жывёл і нават на гаспадара. У гэты перыяд жывёла ўжо не можа глытаць ваду. На трэцяй стадыі з'яўляюцца сутаргі, прагрэсуе параліч. Жывёла амаль увесь час ляжыць і ў выніку гіне ў каматозным стане.

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Ціхая форма характарызуецца развіццём паралічу, слінацёкам, няздольнасцю прымаць ежу. Праз 2—4 дні жывёла гіне.

Атыповая форма — самая складаная ў дыягностыцы. Яна можа доўжыцца да трох месяцаў ці нават больш. Спачатку праяўляецца дыярэяй ці, наадварот, атаніяй кішэчніка, дэпрэсіяй, пасля чаго наступае часовае паляпшэнне. Пасмяротны дыягназ устанаўліваецца пры гісталагічным даследаванні мозгу.

ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЖЫВЁЛА ЗАХВАРЭЛА

Калі гаворка ідзе пра свойскую жывёлу — катоў, сабак, то ім трэба штогод абавязкова рабіць прышчэпкі супраць шаленства. Звяртацца можна ў ветэрынарную станцыю па месцы жыхарства, часам спецыялісты выязджаюць, напрыклад, у мікрараёны Мінска, загадзя апавясціўшы жыхароў пра месца і час вакцынацыі.

Але, калі нават прышчэпленую жывёлу пакусалі іншыя жывёлы, напрыклад, дамашняе кацяня — бадзяжны сабака, цяля на пашы — дзікая ліса, трэба неадкладна звяртацца ў ветэрынарную службу.

Свойскую жывёлу гаспадар павінен даставіць да ветэрынара, пры гэтым паклапаціцца, каб па дарозе гадаванец не змог кантактаваць з іншымі жывёламі і людзьмі. Пасля агляду ветдоктарам жывёла на 10 дзён змяшчаецца на каранцін пад назіранне спецыялістаў.

У некаторых выпадках ветэрынар можа дазволіць, каб жывёла, якая пакусала людзей ці жывёл, была пакінута ў гаспадара пад яго пісьмовае абавязацельства ўтрымліваць яе ў ізаляваным памяшканні на працягу 10 дзён і прад'яўляць для агляду ў тэрміны, вызначаныя ветэрынарным урачом, які ажыццяўляе назіранне.

Вынікі назірання за жывёлай на каранціне рэгіструюцца спецыялістамі ветэрынарнай службы ў журнале і паведамляюцца ў лячэбна-прафілактычную ўстанову, дзе прышчапляюць пацярпелага, і ў цэнтр гігіены і эпідэміялогіі (ЦГЭ) па месцы яго жыхарства (у пісьмовым выглядзе — на працягу сутак, па тэлефоне — неадкладна).

Пасля сканчэння тэрміну каранціну клінічна здаровыя жывёлы пасля папярэдняй вакцынацыі вяртаюцца ўладальнікам пры ўмове іх ізаляванага ўтрымання на працягу яшчэ 30 дзён.

Фота БЕЛТА.

Супрацоўнікі лабараторыі вірусных і прыённых інфекцый пры НДІ эксперыментальнай ветэрынарыі праводзяць чысталагічнае даследаванне ялавічыны.

У выпадку, калі ў населеным пункце, на тэрыторыі садовага таварыства знаходзіцца дзікая жывёла, трэба паведаміць пра гэта ў бліжэйшую ветэрынарную службу, таксама можна звярнуцца да ўчастковага міліцыянера.

ДАВЕДКА: За 9 месяцаў бягучага года ў Беларусі было зарэгістравана 174 выпадкі шаленства дзікіх жывёл, сярод іх: 137 — ліс, 5 — ваўкоў, 3 — ласёў. Сярод хатніх гадаванцаў дыягназ шаленства пацвердзіўся ў 224 асобін, у тым ліку 43 катоў, 69 сабак.

ЯК ЧАЛАВЕКУ ПАЗБЕГНУЦЬ СМЯРОТНАЙ ХВАРОБЫ

Шаленства перадаецца не толькі ад адной жывёлы да другой, але і ад хворай жывёлы да чалавека. Вельмі важна ведаць: шаленства — гэта смяротнае захворванне для чалавека, калі тэрмінова не звярнуцца да ўрача.

Ад укусаў жывёл часта пакутуюць дзеці, таму бацькам трэба тлумачыць ім, што нельга гуляць з незнаёмымі сабакамі, катамі, тым больш падыходзіць да дзікіх жывёл, якія апынуліся на тэрыторыі населенага пункта. Бацькам трэба ўважліва аглядаць дзіцё, бо малое можа не звярнуць увагі на дробную драпіну ад прыблуднага кацяняці. Дзецям неабходна тлумачыць, што нельга падбіраць на дачы, у лесе дзікіх жывёл. Вожыкі, кажаны і дробныя грызуны таксама могуць быць пераносчыкамі шаленства.

Загадчыца аддзялення асабліва небяспечных інфекцый ДУ «Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя» Анастасія ЛЯШКЕВІЧ расказала, што небяспечныя для чалавека не толькі ўкусы і драпіны, але і абслінене пашкоджаных скурных пакроваў і слізістых абалонак, нанесенае жывёлай, хворай на шаленства. Калі такога роду кантакту з хворай (і нават здаровай з выгляду) жывёлай не атрымалася пазбегнуць, трэба правесці першасную апрацоўку раны — старанна прамыць ранавую паверхню на працягу не менш як 15 хвілін струменем вады з мылам; апрацаваць краі раны 5%-най настойкай ёду; накласці стэрыльную павязку і неадкладна звярнуцца ў медыцынскую ўстанову, аптымальна — у дзень негатыўнага кантакту з жывёлай. Звяртацца трэба да ўрача-траўматолага ці хірурга, якія ацэняць рызыку магчымага заражэння вірусам шаленства і прызначаць пры неабходнасці лячэбна-прафілактычны курс прышчэпак.

Анастасія Ляшкевіч падкрэсліла, што ні ў якім разе нельга адмаўляцца ад прызначанага лячэння і самавольна перапыняць яго, гэта можа прывесці да трагічных наступстваў. Курс прышчэпак, з улікам вынікаў назірання за свойскай жывёлай (сабакам ці катом), можа быць скарочаны толькі з дазволу ўрача.

ДАВЕДКА: Апошні выпадак, калі чалавек захварэў на шаленства, зарэгістраваны ў нашай краіне ў 2012 годзе.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

■ У свеце раслін

Жураўліныя ягады

Чым прываблівающь дзікіх жывёл і чалавека чырвоныя балотныя шарыкі?

Калі вы былі восенню на экскурсіі на адным з верхавых балот Бярэзінскага біясфернага запаведніка і ўважліва глядзелі пад ногі, то бачылі на мяккіх падушках сфагнавага моху цёмна-чырвоныя пацеркі. Як вы здагадаліся — гэта ягады журавін, якія сведчаць пра канец восені і пачатак зімы, бо спелымі яны становяцца менавіта ў гэты перыяд.

Фота Дзяніса ЎКОВІЧА.

КІСЛАЯ ПАЦЕРКА

Журавіны — вечназялёны хмызняк сямейства верасовых, лісце якога не ападае восенню і зімуе зялёным пад снегам.

Родавая назва журавіны (Oxycoccus) утварылася ад грэчаскіх слоў «oxis» — «востры, кіслы» і «coccus» — «шарападобны», так званы «кіслы шарык». У XVII стагоддзі ў Новай Англіі журавіны часам называлі «Bearberries» («мядзведжая ягада»), бо людзі часта бачылі, як мядзведзі імі сілкаваліся. Амерыканцы называюць журавіны «cranberry» («ягада-журавель»), бо раскрытыя кветкі на сцяблінах чымсьці нагадваюць шыю і галаву жорава. У Беларусі і Украіне з той жа прычыны гэтыя ягады называюцца журавінамі.

Кветка мае чатыры вострыя пялёсткі, накіраваныя ў розныя бакі, якія ўтвараюць нейкае падабенства зорачкі. Адсюль і другая афіцыйная назва журавін балотных — журавіны чатырохпялёсткавыя.

Цвітуць яны ў маі—чэрвені. А праз некаторы час на месцы кветак ужо можна ўбачыць зялёныя плады, спеюць яны ў верасні—кастрычніку.

СКАРБОНКА ВІТАМІНАЎ

Сумнявацца ў карыснасці журавін не даводзіцца: маленькая ягада змяшчае вялікі спіс вітамінаў і мінералаў, асабліва групы В і С (у гэтым яна прыраўноўваецца да апельсіна, лімона, грэйпфрута і суніц садовых). Журавіны ў Беларусі здаўна лічаць лекавымі ягадамі і нарыхтоўваюць у вялікіх колькасцях. Спелыя ягады збіраюць у верасні, а з надыходам першых лістападаўскіх маразоў пачынаецца другі збор журавін. З іх робяць варэнне і напоі (морсы, сокі, квасы, экстракты, кісялі).

НЕ КОЖНУЮ ЯГАДКУ Ў РУКІ БЯРУЦЬ

Сярод россыпаў журавіны балотнай часам сустракаецца і рэдкая расліна — журавіны драбнаплодныя. Гэта ахоўны від, уключаны ў Чырвоныя кнігі Беларусі і Украіны. Ён расце на тэрыторыі нацыянальных паркаў «Белавежская пушча» і «Нарачанскі». Невялікія групкі такіх журавін растуць таксама і на верхавых балотах Бярэзінскага запаведніка.

Анастасія РЫЖКОВА, малодшы навуковы супрацоўнік ДПУ Бярэзінскі біясферны запаведнік»

■ Экалікбез

Як сярэбраны карась стаў «залатым»

Правіламі вядзення рыбацкай гаспадаркі і рыбалоўства вызначана норма вылаву рыбы: на аднаго чалавека ў суткі — не больш за 5 кілаграмаў. Хапае нават самаму заядламу рыбаку. А вось браканьеры меры не ведаюць, і гэта прыводзіць да канфлікту з законам.

У Беларусі ўжо два гады як уведзена крымінальная адказнасць за незаконнае перамяшчэнне ці перавозку ў транспарце і разбор туш дзікіх жывёл.

Нядаўна пракуратурай Мінскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа па ч. 3 артыкула 282-1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь у дачыненні да 36-гадовага жыхара Нясвіжскага раёна, які перавозіў у сваёй аўтамашыне на адлегласці да аднаго кіламетра ад рыбацкіх угоддзяў 67,2 кілаграма рыбы (карась сярэбраны) без дакументаў, якія пацвярджаюць законнасць валодання рыбай.

Наяўнасць пры сабе або ў машыне больш за 5 кг рыбы без дакументаў, што пацвярджаюць законнасць валодання рыбай, вядзе да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці ў залежнасці ад памеру шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю. У гэтым выпадку шкода ацэнена ў суме больш за 70 тыс. рублёў. Сума падлягае спагнанню ў прыбытак дзяржавы. За гэтыя грошы можна купіць некалькі тон сярэбранага карася. Адным словам, рыба стала «залатой». Да таго ж за такія дзеянні прадугледжана і крымінальная адказнасць у выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 4 гадоў.

Добрасумленным грамадзянам намеснік начальніка аддзела пракуратуры Мінскай вобласці, старэйшы саветнік юстыцыі Рыгор Самойлік рэкамендуе: «Калі набылі жывой рыбы больш за 5 кілаграмаў, дык абавязкова захоўвайце пры сабе чэк ці квітанцыю аб аплаце».

Аксана ЯНОЎСКАЯ

■ Будзем знаёмыя!

Жаўрук, што спявае на зямлі і не ляціць у вырай

Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) абвясціла Птушку-2017. Героем наступнага года стане жаўрук-смяцюх, які ў народзе больш вядомы як чубаты жаўрук.

Птушка гэта не такая прыкметная, як яе папярэднікі, — гогаль і вушастая сава. Але ўвага яму патрэбна цяпер як ніколі, бо колькасць чубатых жаўрукоў у Еўропе за апошнія 30 гадоў скарацілася ажно на 95%. Так атрымалася, што і ў Беларусі смяцюх знікае і занесены ў Чырвоную кнігу. Таму ў наступным годзе мы і прапануем лепей даведацца пра тое, хто такі чубаты жаўрук, якія ў яго праблемы і які кожны з нас можа ўнесці ўклад у іх рашэнне. Як заўсёды, прыродаахоўнікі запрашаюць людзей не толькі больш даведацца пра птушку года, але і дапамагчы ёй справай.

Зімой яму і ў снезе хатка

— Чубаты жаўрук — адзін з 4 відаў жаўрукоў, якія сустракаюцца ў Беларусі. Акрамя яго у нас гняздуюцца палявы і лясны жаўрукі, а рагаты прылятае да нас на зіму з поўначы, — кажа **каардынатар кампаніі АПБ «Птушка года» Карына САЛАВЕЙ**.

Паводле яе слоў, гэтага чырванакніжніка можна ўбачыць аднаго або парамі, радзей — невялікімі групкамі. У адрозненне ад іншых жаўрукоў, часта спявае на зямлі. Увогуле, чубаты жаўрук — аселы від: на зіму птушкі не ляцяць на поўдзень, таму яго можна ўбачыць круглы год. Моцная дзюба дазваляе раздрабняць насенне і насякомых, якія ўмерзлі ў глебу і ў лёд. У моцныя маразы начуе ў снезе. Таксама вядомыя выпадкі, калі чубаты жаўрук кідаецца і закопваецца ў снег, каб выратавацца ад ястрабаў і дзербнікаў.

Сярэдняя працягласць жыцця гэтай невялікай птушкі складае 5—7 гадоў, але сустракаюцца і доўгажыхары. Напрыклад, паводле інфармацыі кампаніі па кальцаванні, самаму старому чубатаму жаўруку было ажно 12 гадоў.

Наш смяцюх лічыцца ў крылатых сапраўдным франтам. Мае вялікі чуб, які востра заканчваецца. У маладых чуб невялікі. Калі ён «размаўляе», то голасам падобны да палявога жаўрука, але больш прарэзлівы і з больш частымі перапынкамі. Покліч — прарэзлівае «дзі-дзіі-трі» або «ірі-трі-тріэ», а таксама мяккае «джютт». Даўжыня цела яго 17—19 см, размах крылаў — 29—38 см.

ДАВЕДКА

Нацыянальную кампанію «Птушка года» АПБ праводзіць з 2000 года. Галоўная мэта кампаніі — прыцягнуць увагу насельніцтва да прыгажосці прыроды і птушак, якія жывуць вакол нас, неабходнасці іх захавання. Мерапрыемствы праходзяць увесь год і даюць магчымасць паўдзельнічаць у акцыях вялікай колькасці чалавек рознага ўзросту, паспрабаваць сваю сілу не толькі ў творчых конкурсах, але і ў прыродаахоўных мерапрыемствах.

Не сябруе з катамі

Актыўнае сямейнае жыццё з гнездаваннем у жаўрукоў дожыцца з красавіка па чэрвень. За сезон яны паспяваюць двойчы вывесці дзетак! Добра замаскіраванае гняздо птушка робіць прама на зямлі. У носцы да 5 яек, якія самка выседжвае 11—12 дзён. Птушаняты пакідаюць гняздо праз 8 дзён пасля вылуплення. «Малыя» яшчэ не ўмеюць лётаць, і ў гэты час асабліва ўразлівыя.

Узбочыны дарог, прамысловыя і жылыя зоны гарадоў з нізкай травой — так выглядае дом чубатага жаўрука ў населеных пунктах. Каб прагнаць канкурэнтаў са сваёй тэрыторыі, самец «глушыць» іх сваім спевам. Але ад яго голасу ўцякаюць далёка не ўсе...

— Адна з сур'ёзных пагроз для чубатага жаўрука і іншых птушак — каты, якія жывуць на вуліцы або выходзяць пагуляць. Калі ў вас ёсць кот — просім дапамагчы і надзець на гадаванца ашыйнік са званочкам. Тады ён не зможа папаляваць на птушку года і ўсіх іншых дзікіх птушак, — заклікае **спецыяліст АПБ па прыродаахоўных пытаннях Сямён ЛЕВЫ**.

Вядома, што ў меню чубатага жаўрука насенне і зялёныя часткі раслін, а таксама бесхрыбетныя. Птушанят кормяць дажджавымі чарвякамі, жукамі, мухамі, матылькамі і іх гусеніцамі, часам слімакамі і павукамі.

Ідэальныя газоны — не даспадобы

У апошнія гады гэтых жаўрукоў у Еўропе засталіся адзінкі. Яны зніклі на гнездаванні ў Нарвегіі, Швецыі і Швейцарыі. Від стаў рэдкім у Беларусі і ўключаны ў нацыянальную Чырвоную кнігу. Пакуль яшчэ часцей сустракаецца на поўдні краіны, а ў цэнтральных і паўночных рэгіёнах — ужо вельмі рэдкі. Чаму яны знікаюць? Галоўныя пагрозы — змена месцаў пражывання: касьба ў гнездавы перыяд, пестыцыды, напады з боку хатніх гадаванцаў, неспакой у гнездавы перыяд.

— Таксама нам патрэбна дапамога людзей у складанні «чубатай» карты: калі ўбачыце птушку года — занясіце дадзеныя на www.florafauna.by. У Беларусі не так многа прадстаўнікоў гэтага віду, і кожная сустрэча важная, — звяртаецца да аматараў прыроды Сямён Левы.

Што яшчэ будзе адбывацца ў год чубатага жаўрука? Птушка-2017 атрымае «прапіску» на плакатах у метро, а таксама па традыцыі стане галоўным героем графіці на адным з дамоў Мінска. На якім — пакуль невядома. Але чытачы могуць прапаноўваць свае месцы. Сумесна з Нацыянальным банкам краіны, Белпоштай плануецца традыцыйны выпуск манеты і маркі з выявай птушкі года. У гарадах і райцэнтрах пройдуць экскурсіі «У пошуках птушкі года», а на клумбах і ў парках, якія прыйшліся па душы чубатай птушцы, з'явяцца папераджальныя таблічкі «Асцярожна, птушка года!». Дарэчы, спампаваць макет шыльды і паставіць у патрэбным месцы зможа кожны. У планах шмат акцый — сачыце і далучайцеся на www.ptushki.org.

У мінулыя гады сімваламі Беларусі былі: белы бусел, белая пліска, авяльга, дамавы верабей, гарадская ластаўка, барадатая кугакаўка, кнігаўка, звычайны салавей, вялікая белая чапля, шэрая гусь, сокал-пустальга, вялікі кулён, чорны свіргуль, удод, звычайная зязюля, вушастая сава і звычайны гогаль.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

Ці можна верыць у народныя прыметы на надвор'е?

Вера ў казку не знікне ніколі. Шматразовыя спробы выкарыстання народных прымет для складання метэаралагічных прагнозаў прыносілі заўсёды толькі расчараванне. Дакладнасць «народных» прагнозаў не ідзе ні ў якое параўнанне з прагнозам пры дапамозе выкарыстання матэматычных мадэляў ці з прагнозам сінаптычным метадам.

У старажытныя часы, калі не было іншых інструментаў прагназавання, людзям нічога не заставалася, акрамя таго, як выяўляць статыстычныя сувязі. У адных выпадках гэты метад апраўдваў сябе, у іншых — не. Таму даволі часта адна і тая ж прымета абяцала супярэчлівы зыход.

Прыметы бываюць розныя: прымеркаваныя да дат (напрыклад, «на Макарыя дождж — на Еўдакію сонца»), кліматычныя (бабіна лета), атмасферныя («дым з трубы слупом — да марознага надвор'я»), прыродныя («мурашкі хаваюцца ў мурашнік ці пад кару — да дажджу»).

Прыметы першага віду не вытрымліваюць ніякай крытыкі. З другіх, кліматычных, тымі, што найбольш спраўджваюцца, з'яўляюцца «вадохрышчанскія маразы» і «чаромхавыя халады». Тлумачыцца ўсё проста: яны заснаваны на кліматычных фактарах. Канец студзеня — гэта самы халодны час. Хочаш — не хочаш, але ў нейкі з дзён будзе марозна.

Трэція прыметы сапраўды маюць месца, паколькі заснаваны на атмасферных з'явах, але праблема ў тым, што яны дазваляюць прагназаваць надвор'е толькі на некалькі гадзін наперад, тады як матэматычныя мадэлі здольныя ажыццявіць прагноз на некалькі дзён. Чацвёртыя, прыродныя, абавязаны спраўдзіцца, бо браты нашы меншыя моцна залежаць ад надвор'я, але пытанне складаецца ў тым, як правільна інтэрпрэтаваць іх паводзіны, бо «разгаварыць» іх на гэту тэму вельмі няпроста.

Да народнай мудрасці трэба ставіцца паважліва. У той жа час метэаралогія ўяўляе сабою навукаёмістую галіну ведаў, і таму разнастайныя народныя прыметы мы правяраем з пункту гледжання таго, наколькі яны збываюцца. І аказалася, што для доўгатэрміновага прагназіравання існуючыя прыметы спраўджваюцца на ўзроўні выпадковай варажбы. Напрыклад, чырвоная рабіна — да суровай зімы, пасля халоднай зімы павінна наступіць гарачае лета; калі ў нейкі дзень у сакавіку курачка пап'е вадзіцы, то трэба чакаць дажджлівага лета. Усе гэтыя прыметы не маюць у наш час ніякай навуковай асновы. Магчыма, калісьці, у іншую кліматычную эпоху, яны «працавалі». Цяпер ніякай сувязі паміж прыметамі і фактамі не існуе.

А вось для кароткатэрміновага прагнозу прыметы маюць свой лагічны і фізічны сэнс. Напрыклад: калі птушкі нізка лётаюць — хутка будзе дождж. Гэта звязана з тым, што машкара, якая з'яўляецца ежай для птушак, пры павялічанай вільготнасці, што папярэднічае звычайна выпадзенню дажджу, не можа высока лётаць, таму птушкі і зніжаюць свой палёт. Яшчэ адна прымета: калі чырвоны захад, то на наступны дзень варта чакаць добрага надвор'я, калі ж сонечны дыск бялявы — у надвор'і адбудуцца змены. Сапраўды, як высветлілі спецыялісты ў вобласці атмасфернай оптыкі, сонечныя прамяні, праходзячы скрозь паветраныя масы з рознымі фізічнымі ўласцівасцямі (гэта значыць паветраныя масы, падзеленыя атмасферным фронтам), зазнаюць змены, і таму сонечны дыск здаецца падчас захаду бялёсым. Але я прапаную ўсім чытачам карыстацца ўсё ж такі не народнымі прыметамі, а прыслухоўвацца да прагнозаў метэаролагаў. Паколькі ўсе гэтыя фактары — павелічэнне вільготнасці, праходжанне атмасферных франтоў — улічваюцца ў іх прагнастычных схемах.

Дзмітрый РАБАЎ, начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Гідрамета

«ТРЫ КІТЫ» ДРУЖБЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВА

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Румыніі ў Беларусі — аб палітычным дыялогу, эканамічных стасунках і культурным абмене

1 снежня ў Румыніі нацыянальнае свята — Нацыянальны дзень краіны. Ён сімвалізуе ўзаконьванне сучаснай румынскай дзяржавы і пацвярджэнне румынскай ідэнтычнасці ў вялікім еўрапейскім кантэксце нацый. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Румыніі ў Рэспубліцы Беларусь Віярэл МАШАНУ другі раз адзначае сваё нацыянальнае свята ў Беларусі: летась, літаральна напярэдадні святочнай даты, адбылося яго прызначэнне на пасаду. Мінуў год. Якім ён аказаўся для дыпламата? Які напрамак мае развіццё румынска-беларускіх адносін? І наогул, якой убачылася паслу Беларусь?

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Спадар Віярэл, што, на Ваш погляд, збліжае нашы краіны?

— Як заўсёды, святкаванне Нацыянальнага дня краіны з'яўляецца добрай нагодай для падвядзення вынікаў ужо зробленага і вызначэння мэт будучай дзейнасці. За апошнюю чвэрць стагоддзя румынскае грамадства прайшло цярністы і складаны шлях рэфармавання ва ўсіх галінах, а таксама адаптацыі да новых рэалій свету. Сёння, рыхтуючыся да святкавання стагоддзя з дня аб'яднання, Румынія з'яўляецца членам самых важных еўрапейскіх і еўраатлантычных арганізацый — ЕС і НАТА, актыўна ўдзельнічае ў еўрапейскіх і сусветных працэсах.

Румынія, адказны член міжнароднай супольнасці, зацікаўлена ў пашырэнні прасторы стабільнасці, развіцця і дабрабыту ў сваім суседстве. Менавіта таму наша краіна вітае намаганні, прыкладзеныя Рэспублікай Беларусь у апошнія гады для таго, каб заявіць пра сябе як пра рэгіянальны фактар стабільнасці. Румынія пазітыўна ацаніла пазіцыю Рэспублікі Беларусь адносна прадастаўлення пляцоўкі для ўрэгулявання ўкраінскага крызісу, узважаны і канструктыўны падыход беларускіх улад да разгляду іншых міжнародных пытанняў.

— Аб якіх станоўчых зменах у румынска-беларускіх адносінах Вы хацелі б расказаць?

— За апошнія два гады мы сталі сведкамі актывізацыі двухбаковых адносін, якія дазволілі ўзняць узровень нашага супрацоўніцтва на больш высокую ступень. Па сутнасці, двухбаковае супрацоўніцтва заснавана на трох галоўных «кітах»: палітычны дыялог, эканамічнае супрацоўніцтва, культурныя, гуманітарныя і міжасобасныя зносіны. Па кожным з вышэйназваных напрамкаў былі зафіксаваны значныя зрухі.

У гэтым годзе атрымаў працяг двухбаковы дыялог на ўзроўні міністэрстваў замежных спраў дзвюх краін шляхам арганізацыі ў Мінску шэрагу кансультацый на ўзроўні намеснікаў міністраў. Таксама адбыўся візіт у Беларусь дэлегацыі парламенцкай групы дружбы «Румынія — Беларусь». Былі арганізаваны рабочыя кантакты і на іншых узроўнях, што паспрыяла ў сваю чаргу каардынацыі дзейнасці бакоў па розных міжнародных пытаннях. Упэўнены, што гэты ўзаемавыгадны дыялог працягнецца і ў наступным годзе. Карыстаюся выпадкам, каб таксама прывітаць рашэнне беларускіх улад адносна нядаўняга прызначэння пасла ў Бухарэсце.

— Чым адметна эканамічнае супрацоўніцтва? Яго вынікі, як вядома, яскрава сведчаць пра зрухі ў сустрэчным напрамку.

— У чэрвені гэтага года ў Мінску была адноўлена работа Міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. З гэтай нагоды таксама адбыўся форум дзелавых колаў дзвюх краін. Думаю, што намаганні па развіцці супрацоўніцтва ў гэтай сферы павінны ставіць большы акцэнт на канкрэтныя праекты, ідэнтыфікаваныя мясцовымі ўладамі, гандлёва-прамысловымі палатамі і інвестыцыйнымі экспертамі. Спадзяёмся, што патрэбны імпульс у інвестыцыйным супрацоўніцтве будзе мець і праграма мадэрнізацыі беларускай прамысловасці, у тым ліку працэс прыватызацыі.

— У чым, Вы лічыце, можа быць яшчэ плён ад нашага партнёрства?

— Румынія заўсёды падтрымлівала развіццё дыялогу і супрацоўніцтва паміж ЕС і Рэспублікай Беларусь і будзе далей прыкладаць да гэтага свае намаганні. Мы вітаем канкрэтныя вынікі новай палітыкі адкрытасці і супрацоўніцтва, адзначаныя ў апошнія два гады: зняцце рэжыму санкцый, развіццё двухбаковага дыялогу па правах чалавека і пытаннях прававой дзяржавы, супрацоўніцтва ў галіне гандлю, інвестыцый, энергіі, мабільнасці грамадзян і інш.

Мы выказваемся за развіццё праектаў і праграм, якія ўяўляюць цікавасць для абедзвюх краін у рамках еўрапейскай палітыкі суседства, якое заключаецца ў тым ліку ў абмене поглядамі адносна прыярытэтаў партнёрства паміж дзвюма краінамі.

Румынія вітае актыўны ўдзел Рэспублікі Беларусь у праграме Усходняга Партнёрства. Мы цэнім цесныя адносіны Беларусі з іншымі яе членамі і асабліва гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з Рэспублікай Малдова, якое аказвае дадатковую падтрымку гэтай блізкай для нас дзяржаве.

— Сваімі гуманітарнымі праектамі Вы здзівілі беларускую публіку сёлета тройчы. Спярша мы апладзіравалі музыкантам-віртуозам, пасля захапляліся вытанчанай пластыкай тэатральных майстроў. І вось цяпер — бенефіс румынскай скульптуры...

— Культурныя праекты нашага пасольства мелі сваёй мэтай стварэнне не толькі новых мастоў пазнання, але і культурных мастоў паміж нашымі народамі, надзвычай важных у цяперашнім свеце з яго праблемамі і нестабільнасцю. Для таго каб нашы народы лепш разумелі адзін аднаго, мы ставілі і будзем ставіць акцэнт на сумесныя румынска-беларускія праекты, накшталт тых, што былі арганізаваны разам з Белдзяржфілармоніяй або нядаўні — з Беларускай акадэміяй мастацтваў.

— Узаемапранікненне культур узбагачае нашы нацыі. Якія творчыя праекты яшчэ наблізяць Беларусь да Румыніі? Відавочна магчымасць і зваротнай сувязі.

— Вядома, хочацца, каб праектаў было як мага больш і каб яны сталі больш разнастайнымі. Адзін з праектаў, які мы хочам арганізаваць у красавіку 2017 года, упішацца ў фармат «Джазавай дыпламатыі», які мы пачалі ў красавіку гэтага года. Гэта новы сумесны праект з удзелам сімфанічнага аркестра Белдзяржфілармоніі, які будзе выконваць музыку знакамітай румынскай джазавай спявачкі. Наогул, гэта павінен быць трохбаковы праект, але імёны я пакуль раскрываць не буду, каб захаваць элемент сюрпрызу. Праз некалькі дзен кіраўнік Беларускага нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў паедзе ў Бухарэст, і мы вельмі спадзяёмся, што пасля яго візіту новыя праекты з'явяцца і ў гэтай сферы. Мы таксама працуем над тым, каб больш актыўным стала супрацоўніцтва паміж нацыянальнымі бібліятэкамі дзвюх краін.

— Як у Румыніі адзначаюць нацыянальнае свята?

— Свята традыцыйна пачынаецца з ваеннага парада, вельмі папулярнага сярод жыхароў вялікіх гарадоў, дзе ён праводзіцца. Пасля гэтага, нягледзячы на зімовае надвор'е, людзі весяляцца на канцэртах, удзельнічаюць у кірмашах. Нацыянальнае свята адзначаецца адразу пасля яшчэ аднаго важнага рэлігійнага свята — 30 лістапада, дня святога Андрэя, які шануецца Румынскай Праваслаўнай царквой як заступнік усіх румынаў. Пачынаючы з бягучага года гэты дзень таксама быў аб'яўлены нерабочым, што надасць агульнаму святкаванню новае, духоўнае адценне.

— Што Вы паведамляеце пра краіну, з якой Вас звязаў лёс дыпламата, на Радзіму?

— Дыпламат у кожнай краіне, дзе ён знаходзіцца, раней ці пазней пачынае адчуваць сімпатыю да народа, культуры, гісторыі таго месца. Інакш немагчыма зразумець грамадства, у якім ты жывеш, і перадаць на Радзіму інфармацыю, патрэбную для развіцця двухбаковых адносін ва ўсіх галінах. Упэўніваю Вас, што такія звесткі наша пасольства паведамляе і будзе паведамляць для таго, каб румыны і беларусы сталі бліжэйшыя, разумелі адзін аднаго лепш і супрацоўнічалі на карысць міра, стабільнасці і дабрабыту нашых нацый.

— У такім выпадку, спадар Віярэл, перадайце сваім землякам ад беларусаў самыя шчырыя словы віншавання. Румынія — краіна, якая не можа не захапляць. Яна вабіць сваёй старажытнасцю, чаруе загадкавай прыродай. Няхай і на душы яе народа будзе заўсёды шчасліва і радасна!

Дзякуй за інтэрв'ю.

Алена СТЭЛЬМАХ.

■ За падзеяй

РАЗАМ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА МЕЖЫ

Дні беларускай культуры паспяхова прайшлі ў Літве

У канцы лістапада ў Вільнюсе на сцэне Рускага драматычнага тэатра Літвы Беларускі акадэмічны музычны тэатр прадставіў балет «Клеапатра», аперэты «Лятучая мыш», «Сільва» і дзве пастаноўкі для дзяцей — «Прыгоды Кая і Герды» і «Бураціна.by». Гэтымі спектаклямі, якія заканчваліся гучнымі апладысментамі, была пастаўлена апошняя кропка Дзён беларускай культуры ў Літве, што доўжыліся аж тры месяцы.

Афіцыйна Дні культуры Рэспублікі Беларусь пачаліся 30 жніўня сумесным выставачным праектам беларускіх і літоўскіх мастакоў «DRAUGE / РАЗАМ». Выстаўка з поспехам праходзіла ў галерэі літоўскага саюза мастакоў «Арка». Беларускую частку праекта склалі работы вядомых майстроў: жывапіс Анатоля Кузняцова, Ірыны Кузняцовай, Тамары Шэлест, Дзяніса Барсукова; графіка Веры Ягоўдзік; фотаздымкі Уладзіміра Парфянка і Аляксея Кузняцова.

— Арганізатарамі экспазіцыі сталі Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў з Мінска, Пасольства Беларусі ў Літве і наша галерэя, — кажа **дырэктар «Аркі», мастачка Давіле ТАМКУТЭ**. — Выстаўка «РАЗАМ» раскрывае тэмы, што аб'ядноўваюць Літву і Беларусь. У агульнай выстаўцы вельмі цікава заўважаць падабенствы і адрозненні ў творчасці літоўскіх і беларускіх мастакоў, адказваць на пытанні «Хто мы?», «Што нас раз'ядноўвае і яднае сёння?» Таму, думаю, выстаўка мае такі вялікі поспех.

У рамках Дзён беларускай культуры сваю творчасць паказалі і тэатральныя калектывы. Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр прывёз гледачам Вільнюса, Шауляя, Шальчынінкая і Швянчоніса пастаноўкі не толькі для дарослых, але і для дзяцей. Так, былі прадстаўлены спектаклі «Васіліса Прыгожая» і «Дзень нараджэння ваўка». Для дарослых паказалі кранальную гісторыю пра каханне «Варшаўская мелодыя» і «Казіны востраў».

— Спектакль «Казіны востраў» — гэта містычная гісторыя-прытча, якая заключае глыбокую філасофію і неўтаймаваную гульню пачуццяў, глыбока прадуманую рэжысёрскую лінію і выдатны склад акцёраў, — сказаў карэспандэнту «Звязды» вядомы **літоўскі пісьменнік Адольфас СТРАКШЫС**.

Магілёўскі абласны драматычны тэатр у Вільнюс прывёз спектакль «Фрэкен Жулі». Цікавасць да гэтай пастаноўкі была не толькі таму, што яе рэжысёр — літовец Саўлюс Варнас. Гэтую драму А. Стрындберга заўсёды суправаджалі скандалы, п'есу забаранялі, пастаноўкі альбо захаплялі, альбо адштурхоўвалі. Літоўскую публіку вабіла і паведамленне, што гэты спектакль удастоены III Нацыянальнай тэатральнай прэміі Беларусі за найлепшую рэжысёрскую работу, а таксама за найлепшую рэжысуру і найлепшую жаночую ролю.

У Цяльшаі і Клайпедзе выдатна выступіў Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі пад кіраўніцтвам Валянціна Дудкевіча.

— Прыемна, што ў творчасці ансамбля адчуваецца смелы пошук свайго харэаграфічнага почырка, імкненне да новых арыгінальных інтэрпрэтацый сталых фальклорных форм. Важна, што ўсе вобразы ствараюцца на аснове багатай спадчыны беларускага народа, — зазначыў вядомы **літоўскі мастацтвазнаўца Альбертас ВАЙДЫЛА**.

Студэнцкі хор Беларускай акадэміі музыкі ўдала выступіў у Вільнюсе і Каўнасе на VI Міжнародным фестывалі харавой сакральнай музыкі імя св. Якава.

Традыцыйнае Свята беларускай песні прайшло ў Вільнюсе ўжо 20-ты раз. У канцэрце прынялі ўдзел аматарскія ансамблі беларускай дыяспары з Вільнюса, Клайпеды, Вісагінаса, Шальчынінкая, госці з Латвіі. У якасці ганаровага госця на святе выступіў Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята».

У рамках Дзён культуры прайшлі таксама мерапрыемствы, прысвечаныя памятным датам класікаў беларускай літаратуры — Якуба Коласа і Максіма Багдановіча. Знакавай падзеяй стаў і Фестываль беларускага кіно.

— Дні беларускай культуры ў Літве скончыліся паспяхова. Трэба і ў будучыні пашыраць культурныя сувязі з нашымі суседзямі, — сказаў **міністр культуры Літвы Шарунас БІРУЦІС**.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве,

г. Вільнюс

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе

ПО ПРОДАЖЕ АПАРТАМЕНТОВ И ГАРАЖНЫХ БОКСОВ в г. СОЧИ,

находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

№ лота	Описание лотов	Начальная цена с НДС, росс. руб.	Задаток, росс. руб.
Лот № 1	Апартамент № 001 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 101,2 кв.м	12 710 276,00	1 271 027,60
Лот № 2	Апартамент № 002 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 59,7 кв.м	7 977 119,00	797 711,90
Лот № 3	Апартамент № 003 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 61,2 кв.м	8 177 011,00	817 701,10
Лот № 4	Апартамент № 004 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение - нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 2. Площадь – 99,6 кв.м	14 429 347,00	1 442 934,70
Лот № 5	Апартамент № 101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 1. Площадь – 101,7 кв.м	13 785 409,00	1 378 540,90
Лот № 6	Апартамент № 104 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № - 1. Площадь – 100,8 кв.м	13 664 046,00	1 366 404,60
Лот № 7	Апартамент № 201 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв.м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот № 8	Апартамент № 202 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 170,9 кв.м	22 739 143,00	2 273 914,30
Лот № 9	Апартамент № 203 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв.м	15 001 895,00	1 500 189,50
Лот № 10	Апартамент № 204 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв.м	10 752 762,00	1 075 276,20
Лот № 11	Апартамент № 205 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв.м	16 980 825,00	1 698 082,50
Лот № 12	Апартамент № 206 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв.м	14 362 240,00	1 436 224,00
Лот № 13	Апартамент № 208 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв.м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот № 14	Апартамент № 209 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв.м	10 135 952,00	1 013 595,20
Лот № 15	Апартамент № 210 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 97,7 кв.м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот № 16	Апартамент № 211 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь –123,3 кв.м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот № 17	Апартамент № 301 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв.м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот № 18	Апартамент № 302 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв.м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот № 19	Апартамент № 303 (2- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв.м	15 001 895,00	1 500 189,50
Лот № 20	Апартамент № 305 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв.м	16 980 825,00	1 698 082,50
Лот № 21	Апартамент № 306 (2- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв.м	14 362 240,00	1 436 224,00
Лот № 22	Апартамент № 308 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв.м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот № 23	Апартамент № 309 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв.м	9 389 213,00	938 921,30
Лот № 24	Апартамент № 310 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв.м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот № 25	Апартамент № 311 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв.м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот № 26	Апартамент № 401 (3- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1540. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,4 кв.м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот № 27	Апартамент № 402 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1536. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 170,9 кв.м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот № 28	Апартамент № 403 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1537. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 103,1 кв.м	16 305 476,00	1 630 547,60
Лот № 29	Апартамент № 404 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв.м	11 108 284,00	1 110 828,40
Лот № 30	Апартамент № 405 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв.м	18 457 171,00	1 845 717, 10
Лот № 31	Апартамент № 408 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв.м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот № 32	Апартамент № 409 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1569. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 60,6 кв.м	9 389 213,00	938 921,30
Лот № 33	Апартамент № 410 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв.м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот № 34	Апартамент № 411 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв.м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот № 35	Апартамент № 501 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв.м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот № 36	Апартамент № 502 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв.м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот № 37	Апартамент № 503 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв.м	16 305 476,00	1 630 547,60
Лот № 38	Апартамент № 505 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1593. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 116,7 кв.м	18 457 171,00	1 845 171,10
Лот № 39	Апартамент № 508 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1552. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,9 кв.м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот № 40	Апартамент № 509 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 60,6 кв.м	9 389 213,00	938 921,30
Лот № 41	Апартамент № 510 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв.м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот № 42	Апартамент № 511 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1571. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 123,3 кв.м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот № 43	Апартамент № 601 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1573. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,4 кв.м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот № 44	Апартамент № 602 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1576. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 170,9 кв.м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот № 45	Апартамент № 608 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1557. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,9 кв.м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот № 46	Апартамент № 609 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв.м	9 389 213,00	938 921,30
